ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

ЗЬВЯЗДА

№ 117 (3225) Нядзеля, 26-га Мая 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

ТОКІЁ, 25. Як паведамляе японскі друк, саюз рыбапрамыслоўцаў выдаў пасьведчаньне некалькім сваім суднам на права вольнай лоўлі рыбы ў савецкіх водах ля паўночных берагоў Камчаткі. Пасол СССР у Японіі, т. Траяноўскі, заявіў японскаму міністру замежных спраў энэргічны пратэст

НАВІНЫ В. С. С. Р.

МАЗЫР. (Наш кар.) Адбыўся выпуск скончыўшых ліквпункты ў Мазыры. Сёлета праз ліквпункты было прапушчана 300 чалавек. Сярод скончыўшых некалькі чалавек, якія яшчэ летась зьлік відавалі сваю няпісьменнасьць, а сёлета працягвалі вучэньне, каб выйсьці з стадыі малапісьменнасьці

ПЕРШЫЯ ПАЎГОДА ПЯЦІГОДКІ

Мінула першае паўгодзьдзе самага цяжкага і важнага году рэканструкцыі. Усе дыспрапорцыі і эканоміка-тэхнічная адсталасьць гаспадаркі, асабліва сельскай гаспадаркі, сказваюцца асабліва востра. Няма нічога дзіўнага, што паасобныя напалоханыя элемэнты ў нашай партыі, капітулянты, апартуністы ва ўсе вушы крычалі аб непасільнасьці зацьверджанага пляну, аб непасільнасьці гэтага тэмпу індустрыялізацыі, аб правале дзяржаўнага бюджету і г. д., і г. д.

Справа даходзіла нават да цьверджаньняў аб наяўнасьці інфляцыі, якія нагадвалі меншавіцкія гутаркі. Аднак, ці апускаюцца рукі пры ацэнцы канкрэтных вынікаў мінулага паўгодзьдзя? Ці накіроўваюць ітогавыя лічбы нашы думкі ў бок патрэбнасьці перагляду гадавога пляну?

Не, і тысячу раз не. Кіруючы фактар эканомікі—сацыялістычная прамысловасьць—паказвае нам значныя дасягненьні і значны скачок наперад. Мы маем права канстатаваць больш або менш нармальнае выкананьне гадавога пляну разгортваньня прамысловасьці. У цяжкіх умовах буйная сацыялістычная прамысловасьць робіць скачок наперад сапраўды вядзіўляючы.

Аднак, побач са значнымі колькаснымі дасягненьнямі трэба з такой-жа сілай адзначыць няпрыемлемасьць якасных паказальнікаў росту прамысловасьці. Заданьне 7-міроцантнага выніканьня ў гадавым рэзэрве вызіўляецца вусім магчымым для выкананьня. **Трэба абсалютна бязьлітасна ўдарыць па руках кожнага, хто спрабаваў-бы стварыць на шляху сацыялістычнага спаборніцтва бюракратычныя перашкоды або хто спрабаваў бы зьвярнуць яго ў спакойнае русло чарговай бюракратычнай кампаніі.**

Важнейшаю ўмовай ажыцьцяўленьня намечанага гадавога гаспадарчага пляну —зьяўляецца хлеб. Крыкі ў абарону НЭП'у сьведчаць толькі аб лібэральным разуменьні НЭП'у. Рост вытворчых сіл краіны дае магчымасьць усё больш шырокім фронтам разгортваць побач з спажывецкай вытворчую змычку з вёскай. **У гэтай іменна вытворчай змычцы сацыялістычнага гораду з вёскай ляжыць парука сацыялістычнай перабудовы вёсні.**

У галіне с.-г. вытворчасьці, нам бясспрэчна, удалося мабілізаваць савецкую вясковую грамадзкасьць вакол пытаньняў вытворчага ўздыму сельскае гаспадаркі. У другім паўгодзьдзі шырока разгортваюцца будаўнічыя работы. На фронце будаўчых работ—далёка ня ўсё здавальняюча. Трэба узьняць работу будаўніцтва на больш высокую ступень. Плян магчымы да выкананьня і ў асноўным будзе выкананы—гэта навочна даводзіць разгортваньне магутнай хвалі самадзейнасьці і ініцыятыўнасьці шырокіх мас рабочае клясы, якія ўступаюць у сацыялістычнае спаборніцтва, і шматмільённай арміі працоўнага сялянства, якое ідзе ўсьлед за імі.

(«Правда»).

АПОШНІЯ МАСКОЎСКІЯ НАВІНЫ

(Ад нашага карэспандэнта)

Ад'езд т. Сырцова

Уноў абраны старшыня Саўнаркому РСФСР т. Сырцоў выехаў у Сібір для вдачы спраў Сібірскага Камітэту УсеКП(б), сакратаром якога ён быў. Праз два тыдні т. Сырцоў вернецца ў Маскву і прыступіць да выкананьня сваіх абавязкаў.

Барацьба з алкагалізмам

Наш карэспандэнт меў гутарку на ўсесаюзным вьевьдзе Саветаў в радам прадстаўнікоў месц аб мерах узмацненьня барацьбы з алкагалізмам.

Адносна гэтага група дэлегатаў вьеводу на чале з т. Ларыным падала спэцыяльную дакладную запіску ў прэзыдыум вьеводу. Магчыма, што гэта запіска будзе абгаворвацца на бліжэйшай сэсіі ЦВК СССР. Большасьць апрошаных дэлегатаў схіляецца да думкі аб неабходнасьці выдаць пастанову ва ўсесаюзным маштабе, якая абмяжоўвала-бы продаж у гарадох алкаголю ў сьвяточныя дні і напярэдадні сьвята.

На барацьбу, на абарону Савецкага Саюзу

Нарада Заходня-Эўрапэйскага Бюро Камінтэрну аб падрыхтоўцы міжнароднага чырвонага дня---1-га жніўня

БЭРЛІН, 23. Заходня-эўрапэйскае бюро Камінтэрну апублікавала паведамленьне, у якім гаворыцца:

15-га мая ў Брусэлі адбылася нарада, скліканая заходня-эўрапэйскім бюро Камінтэрну, у якой прымалі ўдзел дэлегаты ад розных буйнейшых партый эўрапэйскіх капіталістычных краін, а таксама прадстаўнікі КІМ'у і Прафінтэрну. Важнейшым прадметам нарады паслужыла пытаньне **аб падрыхтоўцы міжнароднага дня барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны, назначанага на 1-га жніўня 1929 году.** Важнейшай прадпасылкай для пасьпяховага правядзеньня гэтага дня зьяўляецца поўная перамога і выкараненьне ўсіх правых і прымірэнцкіх плыняй унутры камуністычных партый. **Асновай для правядзеньня кампаніі зьяўляецца рэзалюцыя 6-га кангрэсу Камінтэрну аб барацьбе супроць імпэрыялістычнай вайны.** З гэтай рэзалюцыяй павінны быць шырока азнаёмлены ня толькі партыя, але і ўся рабочая кляса. Галоўнай мэтай кампаніі павінна быць мабілізацыя самых шырокіх мас пралетарыяту і ўсіх працоўных на барацьбу, на абарону Савецкага Саюзу. Як пры падрыхтоўцы, так і пры правядзеньні міжнароднага дня барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны неабходна згуртаваць у адзіны фронт зьнізу самыя шырокія масы рабочых на прадпрыемствах і ва ўсіх пралетарскіх масавых арганізацыях, а таксама стварыць органы гэтага адзінага фронту мас.

Формамі правядзеньня гэтага дня павінны быць **спыненьне работ і масавыя дэманстрацыі.** Неабходным зьяўляецца сыстэматычнае асьвятленьне ўсіх пытаньняў, зьвязаных з падрыхтоўкай вайны супроць СССР у пэрыядычным друку камуністычных партый, а таксама скарыстаньня парляманцкай трыбуны для выкрыцьця падрыхтоўкі вайны супроць СССР.

Нарада заслухала кароткую інфармацыю аб рэвалюцыйным уздыме рабочага руху ў Індыі; нарада пастанавіла паслаць сваё міжнароднае баявое прывітаньне бастуючым тэкстыльшчыкам Бамбея.

Нарада пастанавіла зьвярнуцца да ўсіх рабочых і ўсіх членаў масавых рэвалюцыйных арганізацый з заклікам удзельнічаць у падрыхтоўцы і правядзеньні дня 1-га жніўня. (ТАСС).

Рэпарацыйная канфэрэнцыя ў тупіку

Колькі Нямеччына павінна заплаціць

ПАРЫЖ, 23. Агэнцтва Гавас паведамляе: «Мэмарандум экспэртаў дзяржаў-крэдыторaў вызначае суму нямецкага рэпарацыйнага даўгу ў 37 мільярдаў марак па курсу сёняшняга дня; сярэдні разьмер гадавых рэпарацыйных плацяжоў у працягу першых 37 год вызначаецца ў 1.900 млн. марак, а ў працягу наступных 22 год у разьмеры ад 1.550 да 1.700 мільёнаў марак. У працягу трох апошніх год разьмеры плацяжоў зьніжаюцца да 900 млн. марак у год.

Што датычыцца агаворак Шахта, дык экспэрты дзяржаў-крэдыторaў адхіляюць магчымасьць прадастаўленьня Нямеччыне мараторыя (адтэрміноўкі плацяжоў), але прадастаўляюць банку міжнародных разьлікаў права перагляду схэмы плацяжоў у выпадку зьмены эканамічнага становішча Нямеччыны ці вьмены патрэб-дзяржаў-крэдыторaў. (ТАСС).

Адстаўка нямецкага экспэрта Фэгэлера

БЭРЛІН, 23. Увесь буржуазны друк аднагодна заяўляе аб узьнікненьні сур'ёзных затрудненьняў на парыскай рэпарацыйнай канфэрэнцыі. Затрудненьні выкліканы з аднаго боку, вьместам мэмарандуму саюзьнікаў, які зьяўляецца адказам на нямецкія агаворкі да пляну Юнга. Па думцы друку, адказ саюзьнікаў у значнай ступені вьмяняе плян Юнга на некарысьць Нямеччыны.

Аўтанамісцкі друк патрабуе катэгарычнага адхіленьня мэмарандуму саюзьнікаў. Ускладненьне перагавораў з другога боку выклікана сур'ёзнымі разгалосьсямі ўнутры нямецкай дэлегацыі. Другі галоўны нямецкі экспэрт Фэгэлер, як толькі паявіліся першыя весткі, што саюзьнікі адхіляюць найбольш важную частку нямецкіх агаворак, заявіў аб адстаўцы. Наступнік Фэгэлера Кастль—член прэзыдыўму і кіраўнік справамі агульна-нямецкага саюзу прамыслоўцаў. (ТАСС).

Магчымасьць зрыву канфэрэнцыі

ПАРЫЖ, 24. Як пішуць францускія газэты, нямецкі экспэрт Фэгэлер падаў у адстаўку в прычыны таго, што ён дамагаўся неабходнасьці вызначыць сярэдні разьмер штогодных узносаў Нямеччыны ў суме 1.655 млн. марак, як гэтага патрабаваў першапачаткова Шахт. Акрамя таго, Фэгэлер ня лічыць магчымым плаціць больш 37 год, г. зн. пагашаць саюзьнікоў запазычанасьць Амэрыцы ва кошт Нямеччыны. Гэта матывіроўка адстаўкі Фэгэлера паказвае, наколькі сур'ёзны цяперашні крызіс у работах канфэрэнцыі.

Францускі друк прабуе стварыць уражаньне, што гэтыя патрабаваньні высоўваліся адным Фэгэлерам, як прадстаўніком нямецкай цяжкай прамысловасьці. Аднак, у сапраўднасьці, гэтыя патрабаваньні адпавядаюць лініі нямецкай дэлегацыі цалкам. Друк загадзя ўскладае ўсю адказнасьць за магчымы врыў канфэрэнцыі на нямецкіх экспэртаў, падкрэсьліваючы іх надта моцную залежнасьць ад нямецкай цяжкай прамысловасьці. (ТАСС).

Хлусьня нямецкага друку

ВАРШАВА, 23. Польскае тэлеграфнае агэнцтва падае: Нямецкі друк апублікаваў паведамленьне, у якім гаворыцца, што польскі консул у Харкаве быў закідан каменьнямі, пры чым быў паранены сакратар консульства Шостак. Адносна гэтай інфармацыі ПАТ атрымаў наступныя весткі:

«15-га мая, калі консул Стэблоўскі ў суправаджэньні сакратара Шостака праяжджаў на аўтамабілі, быў кінут в боку маленечкі каменьчык, які папаўшы ў Шостака. У той-жа дзень упаўнаважаны Наркому замежных спраў у Харкаве Куліш выказаў жаль і паведаміў, што віноўны Болдыраў 13-ці год арыштаваны і адпраўлены ў папраўчы дом. З прычыны гэтага справа лічылася консулам Стэблоўскім ліквідаванай. (ТАСС).

Бурныя сцэны ў францускім парляманце

ПОДЛАЯ ВЫХАДКА САЦЫЯЛ-ЗДРАДНІКАЎ

ПАРЫЖ, 24. Учарашняе першае пасяджэньне францускай палаты пасьля аднаўленьня работ адзначылася бурнымі сцэнамі, узьнікшымі пры абгаварэньні патрабаваньняў камфракцыі безадкладна адкрыць дыскусію па інтэрпэляцыі Кашэна аб мерапрыемствах ураду ў зьвязку з першамайскім сьвятам. Патрабаваньне безадкладнага абгаварэньня інтэрпэляцыі Кашэна падтрымлівалася нацыяналістымі, радыкаламі, якія зазначалі на незаконнасьць арыштаў напярэдадні 1-га мая з 3 пал. тысячы ні ў чым нявінаўных грамадзян.

Аднак сацыялісты выступілі ня супроць ураду, а супроць камуністых. Сацыялісты кожную хвіліну перарывалі Кашэна крыкамі аб «чырвоным тэрорыі», называючы першамайскія падзеі «інсэніроўкай», і дагаварыліся да таго, што кампартыя загадзя ўмовілася з Тард'е (міністр унутраных спраў) аб масавых арыштах, каб такім чынам унікнуць сутычкі з паліцыяй. Гэта заява сацыялістых сустракаецца сьмехам нават на лаўках правых.

Кашэн называе гэты паклёп подлым глупствам і запытвае сацыялістых, ці ня ўмовіліся яны з міністрам унутраных спраў таксама аб вобысках, аблавах і арыштах камуністых, якія ня спыняюцца, аб мільённых штрафах за артыкулы камуністычных газэт, аб аннуляваньні абраньня камдэпутатаў.

Адказваючы ад імя ўраду Карт'е апраўдвае арышты неабходнасьцю папярэдзіць «выкананьне пляну мяцежу». Зьвяртаючыся да сацыялістых Карт'е заяўляе, што ён гатоў пашкадаваць іх і не напамінае аб ролі сацыя-дэмакратаў у бэрлінскіх падзеях.

Тэрміновасьць інтэрпэляцыі Кашэна адхілена большасьцю 326 галасоў супроць 258. (ТАСС).

АРЫШТЫ УКРАІНСКАЙ МОЛАДЗІ

ВАРШАВА, 22. Арышты сярод моладзі ў Заходняй Украіне працягваюцца. У Яварове арыштавана 8 украінскіх гімназістых, западозраных у тым, што яны ўдзельнічалі ў патаемнай украінскай вайсковай арганізацыі. 4 украінскіх студэнтаў, заключаных ў турму па абвінавачаньні ў тэрарыстычнай дзейнасьці, абвясьцілі галадоўку. (ТАСС).

Амануллы выяжджае ў Рым

ЛЁНДАН, 25. Агэнцтва Рэйтэр падае: «Амануллы, якому ангельскі ўрад даў магчымасьць праезду ад Аўганска-Індыйскай мяжы да Бамбэю, па чутках, выяжджае ў Рым. Ад'езд Амануллы з Аўганістану выкліканы паражэньнем яго апошніх войск у бойках з войскамі Хабібулы.

Што рабіў генэрал фон-Сэнт у Румыніі

БЭРЛІН, 22. Левая газэта «Бэрлін Ам Морген» друкуе паведамленьне з Румыніі аб тым, што ліберальны дэпутат Арджэнтояну ўнёс у сэнат запытаньне адносна прабываньня генэрала Сэнта ў Румыніі.

У сваім адказе на гэтае запытаньне прадстаўнік ураду заявіў, што падарожжа Сэнта ў Румынію мела выключна прыватны характар. Карэспандэнт «Бэрлін Ам Морген» устанаўліваў, што адказ гэты зусім не адпавядае сапраўднасьці, бо паміж Сэнтам і Маніу вяліся вельмі важныя перагаворы аб фінансаваньні нямецкім капіталам румынскай цяжкай і, пераважна, ваеннай прамысловасьці. Для далейшага вядзеньня пачатых генэралам Сэнтам патаемных перагавораў у Румынію 20 мая прыбыў прадстаўнік заводаў Крупа ў Эсэне. «Бэрлін Ам Морген» з свайго боку зьвязвае паездку генэрала Сэнта ў Румынію з вядомымі паездкамі францускага генэрала Лерона ў Румынію і Польшчу.—**Усё гэта,**—піша газэта,—**паказвае вельмі вялікую актыўнасьць імпэрыялістых і рэальнасьць ваеннай небясьпекі, накіраванай у першую чаргу супроць СССР.** (ТАСС).

Амністыя румынскіх баяраў

ВЕНА, 24. Румынскі парлямант у тэрміновым парадку разглядае законапраект аб амністыі. Вызваленьне падлягаючых амністыі ўжо пачалося. З Бухарэсцкай турмы вызвалена 420 чалавек. Газэты паведамляюць, што Бажору пажыцьцёвае зьняволеньне заменена 20-ці гадовым, а Стэфанаву і Дабраджэану-Гэрэа тэрмін зьняволеньня скарочаны з 8 да 6-ці год. (ТАСС).

Бэсарабскія купцы—за аднаўленьне гандлёвых зносін з СССР

ВЕНА, 18. Румынская газэта «Дымінэаца» паведамляе, што на днях дэлегацыя бэсарабскіх купцоў наведала міністра гандлю і прамысловасьці і прасіла яго дабіцца ў магчыма больш кароткі тэрмін аднаўленьня гандлёвых адносін з СССР. Па словах газэты, у зьвязку з гэтым міністэрства замежных спраў рашыла паслаць свайго дэлегата для ўдзелу ў пасяджэньнях савецка-румынскай цэнтральнай камісіі, якія пачынаюцца 15-га чэрвеня ў Бэндэрах. У палітычных колах ёсьць чуткі, што пытаньне аб аднаўленьні гандлёвых адносін з СССР будзе пастаўлена ў парадак дня пасяджэньняў камісіі. (ТАСС).

V Усесаюзны зьезд саветаў

ПРАЦЯГ СПРЭЧАК ПА ДАКЛАДАХ т. т. КРЖЫЖАНОЎСКАГА і КУЙБЫШАВА

(ВЯЧЭРНЯЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ ЗЬЕЗДУ 24-га МАЯ)

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ тав. ЛУНАЧАРСКАГА

МАСКВА, 24. На вячэрнім пасяджэньні ўсесаюзнага зьезду саветаў 24-га мая працягваліся спрэчкі па дакладах т. т. Кржыжаноўскага і Куйбышава.

Цэнтральным момантам гэтага пасяджэньня зьяўляецца выступленьне народнага камісара асьветы РСФСР тав. Луначарскага ў абарону культурнай часткі пяцігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі. Зьезд сустрэў тав. Луначарскага доўгімі аплёдысмэнтамі.

Для ажыцьцяўленьня пяцігодкі па РСФСР,—кажа тав. Луначарскі,—у бюджэце гэтай рэспублікі не хапае 1.200 млн. руб. На ўсерасійскім зьезьдзе саветаў, які нядаўна закончыўся, я рабіў спэцыяльны даклад аб дзейнасьці Наркамасьветы РСФСР, у якім я даводзіў, што культурная частка пяцігадовага пляну распрацавана вельмі скупа. У самы апошні час Дзяржплян СССР зрабіў папраўкі да культурнай пяцігодкі, у якіх дэкларуе водпуск агульна-саюзных сродкаў дадаткова 800 млн. руб. на культурнае будаўніцтва РСФСР. Аднак, трэба пратэставаць,—кажа далей тав. Луначарскі,—супроць таго факту, што першапачатковыя асыгнаваньні на культурнае будаўніцтва былі ўскладзены цалкам на бюджэт РСФСР. У першыя два гады пяцігадовага пляну ўрад РСФСР, па нашых разьліках, ужо не дасьць 319 млн. руб. на культурнае будаўніцтва.

Тав. Луначарскі падкрэсьлівае, што існуючыя ўмовы для разьвіцьця культурнага будаўніцтва вельмі сприяючыя. У якасьці доваду гэтага ён падае сёньнешнюю гутарку калегіі Наркамасьветы з групай маладых сялян, якія вучацца ў школах сялянскай моладзі. Уражаньне ад гэтай гутаркі зьдзівіла ня толькі яго, Луначарскага, але і іншых членаў калегіі. Сялянская моладзь гаварыла аб сваёй школе, добра ведаючы сваю справу. Гэта—новая парода людзей, якую нам пачынае даваць сучаснася вёска.

На вячэрнім пасяджэньні выступіў таксама наркампрацы СССР тав. Угланаў. Ён намаляваў карціну тых вялізарных зрухаў, якія павінны адбыцца да канца пяцігодкі ў галіне працы. Вялізарнай заваёвай для Савецкага Саюзу зьявіцца ня толькі значнае пашырэньне кадраў індустрыяльных рабочых, ня толькі павышэньне кваліфікацыі гэтых кадраў, ня толькі ўвядзеньне ў фабрычна-заводзкіх прадпрыемствах 7-мігадзіннага рабочага дня, але і значнае скарачэньне беспрацоўя.

На вячэрнім пасяджэньні выступілі таксама т. т. Радыгіна (Вятка), Агамалы-Оглы (Азэрбэйджан), Тукаў (Цэнтр), Андрольнікаў (Урал), Арцюхіна (цэнтр) і інш. (ТАСС).

Усё наша жыцьцё, усе нашы сілы—на справу будаўніцтва сацыялізму

Заключнае слова тав. Кржыжаноўскага

МАСКВА, 25. На зьезьдзе Саветаў на ранішнім пасяджэньні 25-га мая скончыліся спрэчкі па дакладах т. т. Кржыжаноўскага і Куйбышава. Пасьля гэтага з заключным словам выступіў т. Кржыжаноўскі, які спыніўся падрабязна на некаторых пытаньнях, закранутых у спрэчках.

Калі мы складалі наш плян,—сказаў т. Кржыжаноўскі,—дык нашым лёзунгам было: **перадаць яго на суд мас. Тут, у гэтай залі гэты суд адбыўся.** Рашаючы актыў нашай краіны ў асобе Усесаюзнага Зьезду Саветаў зрабіў свой прысуд над пяцігадовым плянам. Я кінуў тут лёзунг: «Даеш пяцігодку». Вы адказалі мне: «даем пяцігодку». Зараз я спакойны за лёс пяцігодкі, бо яна ў вашых руках. **Абавязковаю ўмоваю для ажыцьцяўленьня пяцігодкі зьяўляецца адзінства нашага штабу,—ленінскай камуністычнай партыі,**—заяўляе т. Кржыжаноўскі пад бурныя воплескі залі.

Другою ўмоваю зьяўляецца тое, каб кожны рабочы і селянін мабілізаваў ўсю сваю ўвагу на выкананьне вялікіх задач, пастаўленых пяцігоднаю. Кожны актывісты павінен задаць сабе запытаньне: а што ён можа і павінен зрабіць, каб ажыцьцёвіць гэты вялікі плян?—**Усё наша жыцьцё, усе нашы сілы,усе нашы магчымасьці—на справу будаўніцтва сацыялізму.**

Для складаньня рэзалюцыі па дакладах т. т. Кржыжаноўскага і Куйбышава зьезд абірае камісію.

На вячэрнім пасяджэньні з дакладам аб сельскай гаспадарцы выступіў т. Калінін.

Эканамічны націск ПАЗШ на Францыю

ВАШЫНГТОН, 23. Паводле чутак, міністар фінансаў ПАЗШ Мэлён зьвярнуўся да францускага ўраду з патрабаваньнем даць запэўненьне, што Францыя ратыфікуе згоду аб урэгуляваньні ваеннай запазычанасьці Францыі ПАЗШ. Мэлён падкрэсьлівае, што ПАЗШ ня могуць адтэрмінаваць даўгу ў 400 млн. долараў, які Францыя павінна пагасіць 1-га жніўня ў аплату за амэрыканскую ваенную зброю, калі Францыя ня дасьць абяцаньня ратыфікаваць згоду аб урэгуляваньні ваеннага даўгу ПАЗШ, які складаецца прыблізна в 4 мільярдаў долараў. Па чутках, Мэлён заявіў, што ён толькі ў тым выпадку вможа дамагацца ад кангрэсу, адтэрмінаваньня плацяжу ў 400 млн. долараў, калі будзе забясьпечана ратыфікацыя згоды аб агульным даўгу.

Дэманстрацыі ў Вільні

ВІЛЬНЯ, 24. «Кур. Віл.» паведамляе, што ў сераду і ў чацьвер у Вільні адбылося некалькі арганізаваных камуністымі дэманстрацый—пратэсту супроць зьверстваў Віленскае паліцыі. Беспасрэднымі повадамі для дэманстрацый паслужылі: сьмерць Г. Руфа, цяжка параненага паліцыяй пры разгоне першамайскае дэманстрацыі, і сьмерць знойдзенага павешаным у Лукіскай турме палітвязьня Кёнігсбэрга. У сераду адбылося некалькі маніфестацый у розных пунктах гораду, а ў чацьвер вечарам—перад Лукіскаю турмою. У часе апошняе дэманстрацыі было раскідана шмат камуністычных адозваў.

У Літве

ПРЫСУД НАД АГЕНТАМ ПЛЕЧКАЙЦІСА

ВІЛЬНЯ, 24. Па вестках нямецкага тэлеграфнага агэнцтва в Коўні студэнт Васіліўс прызнаўся, што ён прымаў удзел у выкананьні замаху на Вальдэмараса. Ваенны суд засудзіў Васіліўса на кару сьмерці. («К. Віл.»).

ТЭРОР ПЛЯЧКАЙЦІСТЫХ

БЭРЛІН, 21. «Бэрлінэр Тагэблят» паведамляе, што адзін з плячкайцістых Міцюліс застрэліў у Шагалях камэнданта паліцыі Палецкіса. Апошні арыштаваў Міцюліса па падазрэньню ў прыналежнасьці да плечкайцістых і вёз у места. Міцюліс у дарозе нечакана ўдарыў Палецкіса па галаве, вырваў у яго рэвальвэр і застрэліў яго, а сам уцёк у Латвію.

У Троцкім павеце некалькі плячкайцістых забілі селяніна, якога падазравалі ў намеры выдаць іх уладзе.

Паліцыя і біржа на паслугах у фабрыкантаў

ВАРШАВА, 23. Ужо 4 месяцы цягнецца забастоўка на прадзільні «Воля» ў Варшаве. Дырэкцыя фабрыкі не жадае ісьці ні на якія ўступкі на патрабаваньні рабочых. На днях адміністрацыя пачала прыём на працу штрэйкбрэхэраў, якіх ёй прысылае біржа працы. У бастуючых-жа біржа пачала адбіраць кніжкі на права атрыманьня дапамогі па беспрацоўі. Паліцыя-жа пачала арыштоўваць рабочых прадзільні, якія зьбіраюцца групкамі каля ўваходу на фабрыку. Паліцыя і біржа працы вядуць націск на рабочых, каб прымусіць іх аднавіць працу на ўмовах фабрыкантаў». («Роб.»).

Па Савецкім Саюзе

35-цігадовы юбілей Маскоўскай арганізацыі УсеКП(б)

МАСКВА. У калённай залі Дому Саюзаў адбылося ўрачыстае пасяджэньне з прычыны 35-цігодзьдзя Маскоўскай арганізацыі УсеКП(б). Сакратар Маскоўскага Камітэту т. Баўман адзначыў, што Маскоўская арганізацыя заўсёды трымала высока сьцяг бальшавізму. Ад імя ЦК УсеКП(б) Маскоўскую арганізацыю вітаў тав. Яраслаўскі, адзначыўшы, што яна заўсёды заставалася адданай ленінізму, з барацьбы з хістаньнямі выходзіла заўсёды яшчэ больш згуртаванай.

Сход наладзіў авацыю прысутным старэйшым бальшавіком—заснавальнікам Маскоўскай арганізацыі Міцкевічу, Уладзімерскаму, Вінакураву і інш. Маскоўскую арганізацыю віталі таксама прадстаўнікі Ленінградзкай, Тульскай і Цьвярской арганізацый УсеКП(б), а таксама рабочыя прадстаўнікі маскоўскіх фабрык, заводаў Дзяржэнаку і г. д.

Чыстка КП(б)У пачалася

ХАРКАЎ, 24. Сёньня камісія ЦКК УсеКП(б) у складзе т.т. Сольца (старшыня), Зайцава і Грозава прыступае да праверкі і чысткі членаў і кандыдатаў ЦК і ЦКК КП(б)У, рэвізійнай камісіі ЦК КП(б)У і парткамісіі ўкраінскае ваеннае акругі. (ТАСС).

Каштоўная прапанова жмэрынскіх чыгуначнікаў

ВІНЬНІЦА, 24. Вытворчая нарада жмэрынскіх чыгуначнікаў унесла каштоўную прапанову, якая павінна даць звыш 3½ млн. р. эканоміі ў год. Яна заключаецца ў тым, каб цягнікі, што ідуць па лініі Кіеў—Адэса—Карастэнь і Кіеў—Камянец абслугоўваліся жмэрынскім дэпо, а не кіеўскім, як гэта практыкуецца зараз. Гэта мерапрыемства павялічыць прабег паравозаў на 40 проц. Прапанова жмэрынскіх чыгуначнікаў у бліжэйшы час будзе праведзена ў жыцьцё.

Праект нафтаправоду Масква-Касьпійскае мора

МАСКВА, 24. На сэсіі водна-транспартнай сэкцыі навукова-тэхнічнага савету нафтавай прамысловасьці быў заслухан даклад т. Максімовіча аб тэхнічна-эканамічным абсьледваньні праекту нафтаправоду Масква-Касьпійскае мора, які прадугледжан пяцігодкаю. Нафтапровод амаль у два разы скараціць прабег нафты з Баку ў Маскву супроць існуючай цяпер сыстэмы паравозу яе па вадзе і па чыгунцы. Эканамічная рэнтабельнасьць нафтаправоду даведзена. Нафтапровод разьлічаны на перакачку 1.650.000 тон нафты, пры чым з Баку да Махач-Кала (Пятроўскі порт на Касьпійскім моры) нафта будзе дастаўляцца вадой.

У першую чаргу будзе пабудаваны нафтапровод ад Масквы да Сталінграду, а ў другую чаргу—ад Сталінграду да Махач-Кала. Агульны кошт нафтаправоду —89,2 млн. руб. Штогодная эканомія пры перакачцы нафты па праводу, у параўнаньні з транспартаваньнем яе па вадзе і чыгунцы складае каля 8 млн. р. Нафтапровод можа быць пабудаваны ў 2 гады.

Ціха-акіянскі зьезд прафсаюзаў—15-га жніўня

МАСКВА, 24. Прэзыдыум УсеЦСПС заслухаў паведамленьне тав. Лазоўскага аб Ціхаакіянскім зьезьдзе прафсаюзаў, які адкрываецца 15-га жніўня ва Ўладзівастоку. Пастаноўлена стварыць ва Ўладзівастоку бюро ЎсеЦСПС па садзейнічаньні падрыхтоўцы Ціха-акіянскага зьезду і па прыёме дэлегатаў.

Пуск магутнага карбіднага заводу

СТАЛІН, 23. У Макееўцы пушчаны ў рух адзіны па сваёй магутнасьці і абсталяваньню карбідны завод. Максымальная прадукцыйнасьць заводу 7-8 тон карбіда-кальцыя ў суткі. Пуск заводу мае важнае значэньне ў зьвязку з вострым недахопам карбіду ў мэталюргіі СССР.

Супроць крывавай расправы Бэрлінскіх сац.-паліцэйскіх

Агульны сход працаўнікоў Наркамзему пасылае братэрскае прывітаньне пралетарыяту заходня-эўрапэйскіх краін, які гэраічна змагаецца за сваё вызваленьне з-пад ярма капіталістых і іхніх сацыял-фашысцкіх дапаможнікаў, і які крывёю сотняў сваіх лепшых барацьбітаў заплаціў за права сьвяткаваць 1-мая—сьвята міжнароднай пралетарскай салідарнасьці.

Няхай ведаюць пралетарыі Бэрліну і іншых гарадоў Захаду, што мы заўсёды гатовы ім дапамагчы ў іх цяжкай барацьбе.

Сход пастанаўляе, **зрабіць 1 проц. адлічэньне ад месячнай зарплаты** ў дапамогу сем'ям ахвяр першамайскіх падзей у Бэрліне.

Сход выклікае працаўнікоў Бельсельтрэсту і акруговых зямельных аддзелаў Беларусі пасьледваць яго прыкладу.

Ганьба і сьмерць катам і здрадзікам рабочае клясы!

Няхай жыве рэвалюцыйны пралетарыят ва ўсім сьвеце і яго братэрская салідарнасьць!

* * *

Мы працаўнікі сувязі Менскага вузлу кляймім ганьбаю і шлем сваё праклясьце сацыял-здраднікам, якія прадалі рабочых на зьдзекі буржуазіі.

Мы шлем сваё гарачае братэрскае прывітаньне працоўным Бэрліну і іншых капіталістычных краін.

Проч, залітых крывёю рабочых вуліцы Бэрліну, сацыял-дэмакратаў.

Мы заклікаем рэвалюцыйны пралетарыят Нямеччыны і ўсяго сьвету стаць пад сьцягам Камінтэрну--адзінага штабу сусьветнай рэвалюцыі для канчатковай перамогі над капіталам. Няхай жыве адзінства пралетарыяту ўсяго сьвету.

Няхай жыве сусьветны Кастрычнік!

На дапамогу палітвязьням і іх сем'ям пастанаўляем адлічыць 1 проц. месячнага заработку і пусьціць падпісны ліст сярод членаў прафсаюзу працаўнікоў сувязі.

* * *

Віцебскія пажарнікі-дабраахвотнікі, заслухаўшы інфармацыю аб крывавых расправах над рабочымі сацыял-паліцэйскіх у першамайскія дні ў Бэрліне, пратестуюць супроць наглай правакацыйнай выхадкі ката-здрадніка Цэргібэля і яго прысьпешнікаў.

Ганьба II-му інтэрнацыяналу!

Няхай жыве гэраічны пралетарыят Нямеччыны!

* * *

Агульны сход калектыву Мазырскага Аддз. Гомснажсаюзу кляйміць ганьбаю здраднікаў сацыял-дэмакратаў, якія сумесна з фашыстымі растрэльвалі рабочых у дзень 1-га мая.

Сход пастанавіў: адлічыць на дапамогу ахвярам Бэрлінскіх падзей адну чэньвярць аднадзённага заработку. Выклікаем пасьледваць нашаму прыкладу калектывы Мазырскага ЦРК і спажывецкае таварыства «Змычка».

Няхай жыве рэвалюцыйны пралетарыят Бэрліну!

Няхай жыве Кампартыя Нямеччыны!

Няхай жыве Камінтэрн!

* * *

Агульны сход членаў прафсаюзу і чырвонаармейцаў пагранічнага атраду ў колькасьці 500 чалавек, з пралетарскім абурэньнем кляймяць ганьбаю—жандара нямецкай буржуазіі,—сацыял-дэмакратаў, утварыўшых крывавую расправу над мірнымі дэманстрантамі Бэрліну і іншых гарадоў Нямеччыны.

Для аказаньня матар'яльнай дапамогі сем'ям забітых і параненых рабочых Бэрліну пастанаўляем адлічыць 50 проц. аднадзённага заработку кожнага члена прафсаюзу і камандзіра атраду.

Мы упэўнены, што Нямецкая рабочая кляса зробіць практычныя выводы з вурокаў фашысцкага тэрору і згуртуецца пад сьцягам Нямецкай кампартыі і Камінтэрну для будучых рэвалюцыйных боек супроць нямецкай буржуазіі і сацыял-дэмакратыі, за сусьветную дыктатуру пралетарыяту.

Няхай жыве сусьветная рэвалюцыя!

Няхай жыве Нямецкая рабочая кляса!

За што іх расстралялі

Пад такім загалоўкам газэта «Гудок» паведамляе падрабязнасьці змовы транспартных шкоднікаў. Іх было больш 20 чалавек. Усё гэта былыя акцыянэры Маскоўска-Казанскай, Паўдніёва-Усходняй, Разана-Уральскай і Віндава-Рыбінскай чыгунак. Мэк і Вялічка былі на чале гэтай кампаніі шкоднікаў.

«Гудок» піша: «**Яны спрабавалі стварыць цяжкі транспартны крызіс. Яны імкнуліся стварыць гэты крызіс шляхам развалу ў першую чаргу паравознае справы. Дзеля гэтага па пляну закупалі, разбуралі паравозныя катлы і мэханізмы, а таксма проста зьнішчалі годныя паравозы ці здавалі іх як лом «Рудметалоторгу».**

Гэтыя агідныя шкоднікі разьбілі шмат паравозаў. Яны здавалі ў лом годныя запасныя часткі. Яны патрацілі ўсе свае «таленты» на тое, каб шкоднікай дэзарганізацыяй парушыць сыстэму запасных частак на заводах ВСНГ. Разбурэньне паравознага парку яны прыкрывалі ілжывымі статыстычнымі данымі. Яны аблыталі ілжывым павуціньнем дэзарганізацыі ў

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Агонь па апартунізьме

Бязьлітасны ўдарым па дэзэртырах на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, па капітулянтах перад дробна-буржуазнай стыхіяй

Вясковы камуністы—барацьбіт за сацыялістычную перабудову вёскі

Жорсткая барацьба з правым ухілам і прымірэнцтвам, з канкрэтнымі праявамі правага ўхілу ў практычнай рабоце васковых парт'ячэек—асноўныя ўмовы для ажыццяўлення генэральнай лініі партыі ў адносінах вёскі.—Вясковыя партыйцы—арганізатары калгасаў.—Той, хто зрывае калектывізацыю, той, хто скажае клясавую лінію і зьвязаны з кулаком,—той нічога агульнага з партыяй ня мае

Цвёрдае, выразнае правядзеньне пралетарскай клясавай лініі, арганізацыя беднаты і батрацтва і ўмацаваньне іх бяёку з серадняком для паступленьня на кулака, энэргічнае разгортваньне работы па калектывізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, ідэалёгічная ўстойлівасьць у барацьбе з ухіламі ад генэральнай лініі партыі, асабліва барацьба з канкрэтнымі праўленьнямі правага ўхілу ў практычнай рабоце,—такія асноўныя патрабаваньні, якія партыя прад'яўляе да сваіх вясковых арганізацый.

Ці адпавядае зьмест работы вясковых партарганізацый гэтым важнейшым патрабаваньням? Далёка ня ўсюды і не заўсёды. Рад абсьледваньняў, праведзеных ЦК і акругкомамі, паказвае, што ў рабоце многіх вясковых ячэек і раённых арганізацый маюць месца грубыя скажэньні партыйнай лініі, невыстарчальная клясавая пільнасьць, шматлікія факты праяўленьня правага ўхілу ў практычнай рабоце і г. д.

ЗАСЬМЕЧАНАСЬЦЬ РАДУ ВЯСКОВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

Першае, што кідаецца ў вочы, гэта засьмечанасьць раду вясковых ячэек чужымі элемэнтамі, якія акулачваюцца ці зрошчваюцца з кулакамі, скажаюць клясавую лінію. Добрым прыкладам у гэтых адносінах зьяўляецца Хоцімская арганізацыя, Магілёўская акругі. У яе складзе няма ніводнага батрака і с.-г. рабочага, вельмі мала беднаты, але затое ёсьць значная праслойка заможных (25проц.). Сярод камуністых Хоцімскай арганізацыі ёсьць напрыклад, такія: Земцаў, 1.—20 дзес. зямлі, 3 коняй, 4 каровы, 3 цялят, 7 галоў дробнае жывёлы; Баранаў—18 з палов. дзесяцін зямлі, 2 кані, 4 каровы, 2 цялят, 9 галоў дробнае жывёлы; Кавалёў С.—4 коняй, 1 жарабя, 3 каровы, 1 цёлка, 11 галоў дробнае жывёлы, 2 хаты. Прыкладна, такое-ж становішча было выяўлена пры абсьледваньні Круглянскай райпартарганізацыі, Аршанскае акругі. Асобныя прадстаўнікі верхавіны вёскі былі выяўлены пры абсьледваньні Заслаўскай арганізацыі, Менскае акругі (праўда, тут склад арганізацыі лепш першых дзьвюх).

ПРАЯЎЛЕНЬНІ ПРАВАГА ЎХІЛУ Ў ПРАКТЫЧНАЙ РАБОЦЕ

Пралезшы ў склад вясковых парт'ячэек, прадстаўнікі заможна-кулацкай верхавіны вёскі нярэдка разлагаюць ячэйкі знутры, прыкрываючыся партбілетам, праводзяць клясава-чужую лінію. Засьмечанасьць складу вясковых парт-арганізацый зьяўляецца ўдзячнай глебай для працьвітаньня сярод асобных партыйцаў ня толькі правых настрояў, але і правых спраў. У радзе выпадкаў ячэйкі гублялюць клясавую пільнасьць, паасобныя камуністыя трапляюць у палон дробна-буржуазнай стыхіі, спаўзаюць з клясавай лініі.

Замест таго, каб быць сапраўды авангардам у справе сацыялістычнага перабудаваньня вёскі, нярэдка камуністыя плятуцца ў хвасьце, даючы адмоўны прыклад для беспартыйнага бядняцка-серадняцкага сялянства. Асабліва яскрава гэта праяўляецца ў пытаньні калектывізацыі гаспадарак вясковых камуністых. Узяць каця-б тую-ж Хоцімскую арганізацыю. У гэтым раёне ў 1929 годзе арганізавана 12 новых калгасаў, а з усяго складу арганізацыі ў калгасы ўступілі ўсяго 2. Камуністыя і камсамольцы тут не зьяўляюцца ініцыятарамі калектывізацыі, а некаторыя патаемна нават процідзейнічаюць яе правядзеньню. Уплыў клясава-чужых элемэнтаў, што пралезьлі ў партыю, выявіўся ў тым, што, напрыклад, Бяседаўская ячэйка на пытаньні аб калектывізацыі ўхваліла такую пастанову: «прымаючы пад увагу, што раён сельсавету эканамічна яшчэ слабы, насельніцтва накультурнае, а таму кельга ўжываць складаных форм калектывізацыі».

У Круглянскім раёне 7 партыйцаў, ня гледзячы на катэгарычную прапанову РК, адмовіліся ісьці ў калгасы, з 71 члена арганізацыі ў калгасах усяго 2. У Заслаўскім раёне (у момант абсьледваньня) у калгасе ня было ніводнага партыйца. У Магілёўскай акруговай арганізацыі з 487 вясковых камуністых, занятых выключна сельскай гаспадаркай, і 211, што сумяшчаюць сельскую гаспадарку са службай, у калгасах знаходзіцца ўсяго 62 чал. З 89 вясковых партыйцаў (па Маг. акр.), апытаных па пытаньні калектывізацыі, згодны ўвайсьці ў калгас і вядуць работу ў гэтым напрамку—18, не вядуць ніякай работы і не далі простага адказу аб жаданьні ўступіць у калгас—30. 28 аказалі, што сям'я ня згодзіцца ісьці ў калгас.

ЧЫСТКА ЎЗМОЦНІЦЬ РАБОТУ ВЯСКОВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

Партыя патрабуе, каб кожны камуністы быў правадыром і арганізатарам мас у справе сацыялістычнага перабудаваньня вёскі, быў-бы прыкладам непрымірымасьці ў клясавай барацьбе, ідэалёгічнай стойкасьці і дысцыплінаванасьці. З паданых вышэй прыкладаў (а лік іх можна было-б павялічыць) бачым, што гэтых якасьцяй не хапае многім нашым камуністым і нават цэлым ячэйкам.

Надзвычайная невыстарчальнасьць пралетарскіх кадраў і вялікая засьмечанасьць вясковых ячэек прыводзіць да таго, што ў іх рабоце нярэдкія факты яўнай змычкі з кулацтвам, грубага скажэньня клясавай лініі, фактаў канкрэтнага праяўленьня правага ўхілу ў практычнай рабоце. Няправільнае разьмеркаваньне крэдыту, недаацэнка работы па арганізацыі беднаты, ігнараваньне калгаснага будаўніцтва, палёгкі кулаком,—усё гэта нярэдка можна спаткаць у нашых вясковых ячэйках.

Таму пытаньне аб умацаваньні вясковых партыйных арганізацый стаіць цяпер з асаблівай вострасьцю. Зразумела, што ўмацаваньне вясковых ячэек павінна ў першую чаргу пайсьці па лініі **рашучай чысткі** іх ад клясава-чужых элемэнтаў, ці ад такіх, што зрастаюцца з кулацтвам, ад партыйцаў, якія ня прымаюць удзелу ў правядзеньні вярбоўкі ў партыю, асабліва ў часе Кастрычнікавага закліку (пагоня за колькасьцю без дастатковага вучоту якасьці прымаемых, пры неналаджанасьці работы па іх партвыхаваньні), што прывяло да некаторай засьмечанасьці арганізацыі.

г) Недастаткова разгорнута самакрытыка, асабліва сярод рабочых і работніц, меў месца рад выпадкаў грубога парушэньня рабочай дэмакратыі, камандаваньня з боку паасобных работнікаў (перавыбары фабкому, вылучэньне майстроў) і цесьвячасовае рэагаваньне на іх з боку РК. Узрастаючая актыўнасьць рабочых слаба і няўмела скарыстоўваецца для паляпшэньня вытворчасьці, рацыяналізацыі, паляпшэньня якасьці прадукцыі, канкрэтныя дасягненьні ў гэтай галіне зусім нязначныя.

д) Пры наяўнасьці антысэмітскіх настрояў сярод паасобных груп рабочых, раду выпадкаў адкрытых антысэмітскіх выступленьняў, нацработа пастаўлена надзвычайна слаба. Работа па інтэрнацыянальным выхаваньні не наладжана, мерапрыемствы па барацьбе з антысэмітызмам посяць кампанейскі характар, работа па беларусізацыі зусім не разгорнута, амаль што зусім не вядзецца работа сярод рабочых-палякаў і яўрэяў.

II. Сакратарыят ЦК прапануе райкому і ўсёй арганізацыі перабудаваць сваю работу ў напрамку перанясеньня цэнтру цяжкасьці на вырашэньне наступных першачарговых задач, якія выцякаюць з важнейшых дырэктыў партыі і з асаблівасьцяй раёну:

1) Паставіць асноўнай задачай ідэалёгічнае ўзмацненьне партарганізацыі, яе ідэйна-палітычнае выхаваньне і загартаваньне на практычнай рабоце па перамаганьні цяжкасьцяй сацыялістычнага будаўніцтва, на барацьбе з ухіламі ад генэральнай лініі партыі. Улічваючы вялікі рост арганізацыі ў часе Кастрычнікавага закліку, слабасьць выхаваўчай работы з новым папаўненьнем і ў сувязі з гэтым наяўнасьць у арганізацыі значнай колькасьці пасыўных і недысцыплінаваных элемэнтаў, а таксама рэзкі ўпад тэмпу росту арганізацыі пасьля Кастрычнікавага закліку, райкому паставіць аднэй з першачарговых задач паляпшэньне яканасьці складу арганізацыі. Праводзячы работу па чыстцы арганізацыі ад няўстойлівых і разлажыўшыхся, прыняць захады да ўзмацненьня тэмпу росту за лік лепшых рабочых і работніц, улічваючы пры прыёме іх вытворчы стаж, адносіны да вытворчасьці, удзел у грамадзкай рабоце і г. д. Практыкаваць спэцыяльныя нарады і гутаркі з групамі рабочых-актывістых па пытаньнях вярбоўкі ў партыю, арганізацыю гурткоў беспартыйнага актыву для падрыхтоўкі да ўступленьня ў партыю, уцягваць беспартыйных актывістых у паліткурсы, паліттурткі, на адкрытыя партдні і г. д. У сувязі з тым, што партпраслойка сярод работніц «Дзьвіны» вельмі нязначная, самым энэргічным чынам разгарнуць работу па вярбоўцы ў партыю работніц у першую чаргу з больш вытворчым стажам. Пэрыядычна правяраць пастаноўку работы па вярбоўцы ў партыю і якасьць новага прыцёку.

2) АК і РК прыняць самыя рашучыя меры да паляпшэньня пастаноўкі партвучобы ў раённай арганізацыі, наладзіўшы ў першую чаргу сыстэматычную работу па канкрэтным растлумачэньні сутнасьці правага ўхілу і прымірэнчых да яго адносін, не абмяжоўваючыся агульнымі, адцягненымі дакладамі. Пры пабудове сеткі партасьветы паставіць задачу поўнага абхопу ёю ў першую чаргу кандыдатаў, маладых членаў партыі і адстаючых старых партыйцаў. Максымальна прыстасаваць сетку партасьветы да ўзроўню і бытавых умоў і неразуменьне сутнасьці правага ўхілу сярод значнай часткі арганізацыі, вельмі значная колькасьць хваравітых зьяў сярод членаў арганізацыі, недастатковая згуртаванасьць паасобных ячэек, што тлумачыцца ў першую чаргу слабасьцю партвыхаваўчай работы і ня зусім выразнай лініяй у правядзеньні вярбоўкі ў партыю, асабліва ў часе Кастрычнікавага закліку (пагоня за колькасьцю без дастатковага вучоту якасьці прымаемых, пры неналаджанасьці работы па іх партвыхаваньні), што прывяло да некаторай засьмечанасьці арганізацыі.

г) Недастаткова разгорнута самакрытыка, асабліва сярод рабочых і работніц, меў месца рад выпадкаў грубога парушэньня рабочай дэмакратыі, камандаваньня з боку паасобных работнікаў (перавыбары фабкому, вылучэньне майстроў) і цесьвячасовае рэагаваньне на іх з боку РК. Узрастаючая актыўнасьць рабочых слаба і няўмела скарыстоўваецца для паляпшэньня вытворчасьці, рацыяналізацыі, паляпшэньня якасьці прадукцыі, канкрэтныя дасягненьні ў гэтай галіне зусім нязначныя.

д) Пры наяўнасьці антысэмітскіх настрояў сярод паасобных груп рабочых, раду выпадкаў адкрытых антысэмітскіх выступленьняў, нацработа пастаўлена надзвычайна слаба. Работа па інтэрнацыянальным выхаваньні не наладжана, мерапрыемствы па барацьбе з антысэмітызмам посяць кампанейскі характар, работа па беларусізацыі зусім не разгорнута, амаль што зусім не вядзецца работа сярод рабочых-палякаў і яўрэяў.

II. Сакратарыят ЦК прапануе райкому і ўсёй арганізацыі перабудаваць сваю работу ў напрамку перанясеньня цэнтру цяжкасьці на вырашэньне наступных першачарговых задач, якія выцякаюць з важнейшых дырэктыў партыі і з асаблівасьцяй раёну:

1) Паставіць асноўнай задачай ідэалёгічнае ўзмацненьне партарганізацыі, яе ідэйна-палітычнае выхаваньне і загартаваньне на практычнай рабоце па перамаганьні цяжкасьцяй сацыялістычнага будаўніцтва, на барацьбе з ухіламі ад генэральнай лініі партыі. Улічваючы вялікі рост арганізацыі ў часе Кастрычнікавага закліку, слабасьць выхаваўчай работы з новым папаўненьнем і ў сувязі з гэтым наяўнасьць у арганізацыі значнай колькасьці пасыўных і недысцыплінаваных элемэнтаў, а таксама рэзкі ўпад тэмпу росту арганізацыі пасьля Кастрычнікавага закліку, райкому паставіць аднэй з першачарговых задач паляпшэньне яканасьці складу арганізацыі. Праводзячы работу па чыстцы арганізацыі ад няўстойлівых і разлажыўшыхся, прыняць захады да ўзмацненьня тэмпу росту за лік лепшых рабочых і работніц, улічваючы пры прыёме іх вытворчы стаж, адносіны да вытворчасьці, удзел у грамадзкай рабоце і г. д. Практыкаваць спэцыяльныя нарады і гутаркі з групамі рабочых-актывістых па пытаньнях вярбоўкі ў партыю, арганізацыю гурткоў беспартыйнага актыву для падрыхтоўкі да ўступленьня ў партыю, уцягваць беспартыйных актывістых у паліткурсы, паліттурткі, на адкрытыя партдні і г. д. У сувязі з тым, што партпраслойка сярод работніц «Дзьвіны» вельмі нязначная, самым энэргічным чынам разгарнуць работу па вярбоўцы ў партыю работніц у першую чаргу з больш вытворчым стажам. Пэрыядычна правяраць пастаноўку работы па вярбоўцы ў партыю і якасьць новага прыцёку.

2) АК і РК прыняць самыя рашучыя меры да паляпшэньня пастаноўкі партвучобы ў раённай арганізацыі, наладзіўшы ў першую чаргу сыстэматычную работу па канкрэтным растлумачэньні сутнасьці правага ўхілу і прымірэнчых да яго адносін, не абмяжоўваючыся агульнымі, адцягненымі дакладамі. Пры пабудове сеткі партасьветы паставіць задачу поўнага абхопу ёю ў першую чаргу кандыдатаў, маладых членаў партыі і адстаючых старых партыйцаў. Максымальна прыстасаваць сетку партасьветы да ўзроўню і бытавых умоў

Аднадушна за пастановы 16-й партканфэрэнцыі

Не дазволім правым рэвізаваць ленінізм

Заслухаўшы даклад тав. Кугеля аб выніках XVI партканфэрэнцыі агульны сход ячэйкі КП(б)Б фабрыкі «Адраджэньне» цалкам і поўнасьцю ухваляе пастановы канфэрэнцыі і далучаецца да іх.

Сход лічыць, што прыняты канфэрэнцыяй пяцігадовы план разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва поўнасьцю адпавядае ленінскую лінію партыі на ўзмацненьне тэмпу індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Партыя не дазволіць правым і прымірэнцам рэвізаваць Ленінізм, рэвізаваць генэральную лінію. Жорстка ўдарым па канкрэтных насіцелях правага ўхілу.

Мы ня пойдзем па шляху правых

Гэтымі днямі адбыўся агульны сход ячэйкі КП(б)Б заводу «Дрэвааапрацоўшчык», на якім быў заслуханы даклад т. Гурэвіча аб выніках XVI усесаюзнай партканфэрэнцыі.

Сход цалкам і поўнасьцю далучыўся да рэзалюцыі, прынятай па гэтым пытаньні актывам менскай партарганізацыі.

У выступленьнях партыйцы заводу «Дрэвааапрацоўшчык» рашуча асудзілі правы ўхіл і прымірэнцтва да яго.

— Мы ня пойдзем па шляху правых укленістых, мы ведаем куды цягнуць усякія ўхілы ад генэральнай лініі партыі—гаварылі прамоўцы ў спрэчках.

Сход выказаўся за неабходнасьць вывучэньня пастаноў XVI партканфэрэнцыі і папулярызацыі іх сярод шырокіх рабочых мас.

Праверка нацыянальнай работы ў БССР

(Скарочаная справаздача пасяджэньня камісіі ЦКК УсеКП(б) па абсьледваньні практыкі нацыянальнай работы ў БССР з кіраўнікамі цэнтральных установаў г. Менску 18 мая г. г.) *)

ДАКЛАД т. ЗАТОНСКАГА

Таварышы! Перад камісіяй ЦК УсеКП(б), якая зараз распачынае працу па абсьледваньні практыкі нацыянальнай работы ў БССР, стаяць вялікія задачы. Практыцы абсьледваньня нацыянальнай работы ў асобных рэспубліках надаецца асаблівае значэньне. Маецца на ўвазе ў гэтым годзе склікаць усесаюзную нацыянальную нараду для правядзеньня вынікаў нац. работы за гэтыя гады ў асобных нацыянальных рэспубліках. Такая нацыянальная нарада была ў 1923 г., але ад таго часу ўмовы зьмяніліся, ёсьць ужо вялікая практыка і зараз можна напрацаваць, ёсьць на чым навучыцца. сёньняшняя наша нарада і ёсьць першай, уступнай у вялікую работу.

Перад намі стаяць тры асноўныя пытаньні: 1) Аб узаемаадносінах БССР з Савецкім Саюзам (па лініі капітарысу, пяцігодак, канстытуцыі); 2) аб працэсе беларусізацыі (партыі, камсамолу, прафсаюзаў, савецкага апарату, Чырвонай арміі, школы, палітасьветных і навуковых устаноў, прэсы, выдавецтва і г. д.); 3) аб рабоце сярод нацменшасьцяй.

Чым сёньня вачаруўае Беларусь заежджага сюды чалавека—гэта размахам будаўніцтва. Ваша пяцігодка зышць у некалькі столак памножыць гэта будаўніцтва, замураваць ёмкія падваліны пад новы сацыялістычны лад. І вось цікава прасачыць: ці ўвязваецца ваша прамысловасьць з запатрабаваньнямі вёскі ці разгладзіліся дэтальна пляны індустрыялізацыі ў нацыянальным разрэзе, як абслугоўвае і наколькі здавальне зараз ваша прамысловасьць мясцовы рынак. Папярэднія матар'ялы, з якімі знаёміліся, усё-ж не даюць вычэрпваючага адказу на гэтыя пытаньні. Саматужная прамысловасьці як-бы мала аддаецца ўвагі.

У галіне гаспадарчага будаўніцтва возьмем такое пытаньне, як вымяўпарадкаваньне. Ня кажучы ўжо аб тым, што ў гэтай рабоце павінна быць у аснове выразная клясавая лінія, але гэта мае і нацыянальнае значэньне таксама. І якую-б мы галіну работы не ўзялі, усюды трэба праверыць, як там ажыццяўляецца лінія партыі і наша нацпалітыка.

Нашае папярэдняе ўражаньне такое, што як быццам у вас занадта займаюцца пытаньнямі вузка-культурніцкімі, падымаецца шмат культурных пытаньняў, але слаба ўлічваюцца ў нацыянальным разрэзе пытаньні эканомікі, як разгортваньне прамысловасьці, заняцьце рабочых рук, зямляўпарадкаваньне і г. д.

Камісіі трэба будзе пільна праверыць, наколькі шчыльныя ўзаемаадносіны БССР з Савецкім Саюзам.

З тых папярэдніх матар'ялаў, якія мы атрымалі, не адчуваецца ў патрэбнай меры выразнай пастаноўкі перад масамі думкі аб тым, што пытаньне разьвіцьця БССР цесна зьвязана з разьвіцьцём СССР як у эканамічных, так і культурных адносінах. Каб у гэтай галіне культуры былі ў вас стопроцантныя дасягненьні, то ня было-б, напэўна, «тэатральнай дыскусіі», выступленьняў Дудара, Зарэцкага, Александровіча і Жылуновіча.

Па ўсіх закранутых тут мною ў кароткіх рысах пытаньнях трэба вам, як кіраўніком цэнтральных установаў, падаць для камісіі матар'ялы і свае думкі па асобных пытаньнях.

Па дакладу т. Затонскага разгарнуліся жывыя спрэчкі.

ПРАМОВА т. ДУБІНЫ

Я згодзен з заўвагамі т. Затонскага наконт недастатковага абслугоўваньня нашай прамысловасьцю мясцовага рынку. Мы сёлета, праводзячы веснавую пасеўную кампанію, сустрэліся з такімі фактамі, што выпісваем **малочны пасудан** з заграніцы. Гэта-ж сьмеху варта такая работа! У той час, як нашы прадпрыемствы тут у нас дома з вялікім посьпехам і ў час малмі-б выпаўніць гэтыя заказы, мы марна трацім грошы на імпарт. Значыць, пытаньню абслугоўваньня нашай прамысловасьцю патрэб сельскае гаспадаркі, таксама і нашай саматужнай прамысловасьці, мы мала аддаем увагі. Зараз у нас вельмі шмат арганізавалася дробных, мясцовых вытворчых т-ваў і прадпрыемстваў, галоўным чынам па вырабе будаўнічых матар'ялаў (цэглы, чараліцы). Усе яны абслугоўваюць галоўным чынам патрэбы вёскі і мястэчка. Але яны ў нас яшчэ знаходзяцца ў бяспрытульным становішчы. Больш увагі мясцовай прамысловасьці.

ПРАМОВА т. БЭЙЛІНА

Аб індустрыялізацыі. Мы павінны будаваць нашу прамысловасьць ня толькі для Беларусі. У нас павінна быць такая прамысловасьць, якая абслугоўвала-б і саюзны рынак.

Адносна ўпарадкаваньня мястэчак, наогул вырашэньня местачковага пытаньня, я асьцерагаюся казаць, што мы самі, толькі ў адной БССР, вырашым гэта пытаньне. Яго трэба ставіць у Саюзным цэнтры. Упарадкаваць местачковую беднату—ці хопіць у нас сродкаў у бліжэйшы час? Праўда, мы ў гэтай галіне маем вялікія дасягненьні, мы арганізавалі 250 яўрэйскіх калгасаў, але-ж такі тэмп не вырашае ўсёй праблемы.

Праўда, што саматужнай прамысловасьці мала аддаецца ўвагі. Летась мы на разьвіцьцё і ўзмацненьне саматужнай прамысловасьці адпусьцілі 200.000 руб. Гэткім укладам мала дапаможаш справе.

Я хачу зьвярнуць увагу на работу нашага друку, які па маёй думцы, таксама мала адводзіць увагі асьвятленьню нацыянальнай праблемы. Горш таго, бываюць выпадкі, вывіхі ў рабоце.

Я маю на ўвазе артыкул у газэце «Савецкая Беларусь», надасланы з Полацку і зьмешчаны ў № 101 пад загалоўкам «Б'ем трывогу, ставім пытаньне»... Гэты артыкул зьяўляецца антысэміцкі-нагромным артыкулам (т. Платун: правільна!) Праверка камісіі ЦКК павінна ахапіць усе дасягненьні і недахваты нацработы.

ПРАМОВА т. БАЛІЦКАГА

Папярэднае ўражаньне, якое зложылася ў т. Затонскага аб тым, што ў нас у нацработе культурніцкі ўхіл—няправільнае. Я лічу, што ў нас ёсьць некаторая недаацэнка культуры. Праўда, былі такія настроі, што нацыянальная палітыка заключаецца толькі ў культурнай рабоце, але з гэтым вялася рашучая барацьба. Таксама няправільная думка т. Затонскага аб тым, што мы слаба рэагуем на праяўленьні шавінізму. Былі ў нас такія праявы, былі погляды на Захад, але мы вялі з гэтымі праявамі належную барацьбу.

Далей, калі мы кажам аб беларускай прамысловасьці, дык ня трэба забываць, што Беларусь існуе толькі 8 год, гэта значыць мы толькі пачалі адбудоўвацца і прытасоўвацца да нацыянальных умоў. У гэтым годзе ў Гомелі калі чаецца пабудова вялікага заводу сельска-гаспадарчых машын, прыстасавання для ўмоў Беларусі. Я лічу, што наша прамысловасьць павінна ў першую чаргу абслугоўваць Беларусь, у процілегласьць таму, як некаторыя думаюць, што трэба абслугоўваць саюзны рынак.

ПРАМОВА т. МАСЮКОВА

Ня можна разглядаць нашу прамысловасьць толькі з пункту погляду задаваленьня патрэб нашай вёскі. Наша прамысловасьць яшчэ ня стала на грунтоўны шлях здавальненьня попыту мясцовага рынку. Мы, напрыклад, маем свае мінэральныя ўгнаеньні, але іх не апрацоўваем і прымушаны прывозіць з другіх рэспублік. Эканоміка народнай гаспадаркі БССР злажылася так, што нам трэба ствараць буйныя гаспадарчыя цэнтры ня толькі для здавальненьня патрэб мясцовага рынку, а для заняцьця рук беспрацоўных, стварэньня пралетарскіх цэнтраў, умацаваньня і разьвіцьця сельскай гаспадаркі і г. д.

Калі мы кажам аб індустрыялізацыі, пытаньне аб саматужнай прамысловасьці не павінна адыходзіць ад нашых вачэй.

Аб мястэчках. Я лічу, што сваімі сіламі мы ня зможам вырашыць местачковую праблему, трэба яе вырашаць ва ўсесаюзным маштабе.

ПРАМОВА т. УНАРОЎСКАГА

Я спынюся на структуры работы сярод нацыянальных меншасьцяй. Наша структура ва ўмовах БССР значна розьніцца ад структуры Украіны. Там ёсьць аддзелы нацменшасьцяй, якія вядуць падлік нацыянальнай работы, у нас-жа нацыянальных аддзелаў няма і падліку няма каму весьці. Таксама трэба ў будучым абмеркаваць, наколькі наша арганізацыйная структура на савецкай лініі ў нацыянальным разрэзе правільная.

ПРАМОВА т. ПЛАТУНА

Таварышы, якія закранулі пытаньні вямляўпарадкаваньня, правільна адзначалі недахопы яго. Я лічу, што ў нас вялася часамі земская зямельная палітыка. За гэта папала некаторым таварышом з Наркамзему і цяпер клясавая лінія выпраўляецца.

Ня мае рацыі тав. Баліцкі, які лічыць аб шавінізьме і арыентацыі, некаторых колаў інтэлігенцыі на Захад, казаў быццам арыентацыя на Захад «была», я лічу, што яна і зараз праяўляецца ў асобных інтэлігентаў. Возьмем такі факт, як пасылка экспанатаў Бел. Дзярж. музэю ў Кракаўскую акадэмію на экспэртызу. Я ня буду цяпер успамінаць аб нядаўнай так званай «тэатральнай дыскусіі», аб лісьце трох пісьменьнікаў, аб паводзінах часопісі «Полымя» і інш. Аб гэтым можна знайсьці адназначнае ў дакумантах.

Пытаньне аб партыйным кіраўніцтве культурным будаўніцтвам, пытаньне аб новых кадрах. У нас ёсьць ня значная групка беларускай інтэлігенцыі, з якою мы ўвесь час цацкаемся, якая працуе па сваіх настроях. Сёньня гэты інтэлігент піша, ці кажа ва ўгоду нашай знове, заўтра—супярэчыць. Цацканьнем з такімі людзьмі мы толькі адштурхваем ад сябе маладыя, аддаючы нам кадры інтэлігенцыі.

Пытаньне аб вылучэньні новых кадраў на культурную работу трэба паставіць ва ўсю шырыню і сьмела.

Мы вельмі хутка страваем вышэйшыя навучальныя ўстановы, а нізавой сетцы мы мала аддаем увагі.

ПРАМОВА т. СЯНКЕВІЧА

Нашы вышэйшыя навучальныя ўстановы мала займаюцца вывучэньнем Беларусі. Часта нашы ВНУ займаюцца ня тым, чым трэба. Напрыклад, дасьледчы інстытут на працягу трох гадоў займаўся вывучэньнем сусьлікаў. ВНУ, бывае, выдаюць такія кнігі, ад якіх няма карысьці. Трэба зацікавіцца складам выкладчыкаў ВНУ і прагледзець праграмы.

ПРАМОВА т. АГУРСКАГА

Я хачу зьвярнуць увагу камісіі на работу пістпарту. Ва ўмовах БССР мы спатыкаемся з перажыткамі бундызму, мы сустракаемся і з іншымі дробна-буржуазнымі плынямі, як беларускай сацыялістычнай грамады ПІПС і інш. Некаторыя выхадцы з гэтых партый імкнуліся і зараз прабуюць «даказаць», што іх б. партыі ня былі нацыяналістычнымі, а наадварот бальшавіцкімі, што іх партыі зьяўляюцца «правдзівнікамі бальшавізму ў Беларусі». Такія ўхілы праяўляліся ў часе правядзеньня 25-годзьдзя рэвалюцыі 1905 г., а таксама нядаўна ў дні сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя БССР і адзначаньня 1-га зьезду КП(б)Б. У гэты час зьявіўся шкодны артыкул у часопісі «Полымя» № 10, у якім аўтар т. Жылуповіч хацеў «даказаць», што БССР была створана ня дзякуючы Кастрычнікавай рэвалюцыі, не пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, а дзякуючы групе беларусаў, высэкцыі беларусоў пры РКП(б). Супроць гэтага партыі прыходзіцца весьці рашучую барацьбу.

ПРАМОВА т. ІГНАТОЎСКАГА

Па вырашэньні нацыянальнага пытаньня мы асабліва шмат працавалі на XI зьезьдзе КП(б)Б. У матар'ялах XI аб карэнізацыі, шавінізьме і інш. Там ёсьць і аб ухілах, якія праяўляюцца і зараз, зрабіўшыся больш пастаяннымі. Пра становішча нашай асьветы я згодзен з т. Платуном, што мы шмат наадчыняялі вышэйшых навучальных устаноў, а якасьць іх работы ня зусім добрая.

Трэба будзе ў будучым зьвярнуць увагу на тое, што часта мы якога-небудзь шкодніка прагонім, а ён прыладжаецца ў Маскве і адтуль перашкаджае нашай працы. Адзін з такіх прымайстраваўся загадчыкам беларускага аддзелу ў маскоўскім музэі і, калі мы ламатар'ялаў, дык гэты самы тып затрымліваў матар'ял.

Ёсьць яшчэ рад іншых памылак, напрыклад у часопісі «Революция и культура» быў зьмешчан артыкул т. Славіна, які ўзводзіў на партыйнае кіраўніцтва ў Беларусі паклёпы. І калі таварышы напісалі адказ, аправяраючы хлусьню Славіна, дык ён чамусьці быў зьмешчан толькі тады, калі Славін напісаў да гэтага свае заўвагі.

*) Гл. «Зьвязду» №№ [illegible]

СПРАВА РАЗЬВІЦЬЦЯ ГАРОДНІЦТВА НА МЁРТВЫМ ПУНКЦЕ

С.-г. кампэрацыя ня цікавіцца гэтым пытаньнем.—Рынак збыту гародніны не арганізаваны.—У гарадох недахват гародніны, а некаторыя калгасы кормяць ёю жывёлу.—Увагу гарадзкому гародніцтву

Трэба арганізаваць спэцыяльную садова-гародную каапэрацыю

Асноўным мерапрыемствам, якое павінна зрабіць вялікі ўплыў на разьвіцьцё гароднічтва і садаводзтва ў Беларусі, зьяўляецца пастанова ўраду аб арганізацыі на працягу 1928-29 і 1929-30 г. г. аднэй рэспубліканскай і 5-ці акруговых садова-гародніх баз.

Задача гэтых баз—наладзіць справу масавага вырошчваньня пасадачнага і насеннага матар'ялу ўсіх садова-гародніх культур да максымальнага забесьпячэньня імі насельніцтва БССР.

Што зроблена ў гэтай галіне НКЗ Беларусі?

Покуль што практычна гэтая новая для БССР справа слаба пасоўваецца ўперад і ўсё яшчэ знаходзіцца ў стадыі арганізацыі.

Пачата толькі работа па стварэньні каля Менску цэнтральнай садова-гародняй базы ў саўгасе Зацішша: абраны вучасткі для арганізацыі розных аддзелаў садовых і гародніх культур, на плошчы ў некалькі дзесяткаў гэктараў пасаджаны пладовы сад і ягада.

Што-ж датычыць 5-ці астатніх баз у Віцебскай, Аршанскай, Магілёўскай, Бабруйскай і Гомельскай акругах, дык іх арганізацыя пачнецца толькі ў будучым годзе. На працягу лета гэтага году акруговым зямельным аддзелам разам з Белсельтрэстам даручана выдзяліць найбольш падыходзячыя саўгасы, у якіх трэба стварыць садова-гародніх базы і скласьці вытворчыя праграмы баз на будучы год. Наркамзем абяцае, што папярэдняя работа ва ўсіх гэтых базах пачнецца з восені г. г.

Увогуле, плошча пад гародніну ў БССР павінна пашырыцца ў параўнаньні з мінулым годам на 7 проц. Але побач з гэтым трэба прызнаць, што пытаньню гароднічтва практычна ўдзелена мала ўвагі. Друк таксама не вядзе ніякай прапаганды за разьвіцьцё гароднічтва.

Ёсьць толькі частковыя посьпехі, якія носяць характар новаўвядзеньняў, пакуль што нязначных маштабаў. Сёлета, напрыклад, у БССР упяршыню, засяваецца з прамысловай мэтай цыкоры, галоўным чынам, у Гомельшчыне, на плошчы 100 гэктараў. Пасеў закантрактаваны Цэнтрасаюзам. Да гэтай справы прыцягнуты ў большай частцы каапэраваныя сялянскія гаспадаркі.

Каля 10 гэктараў цыкорыю засявае і Белсельтрэст. Гэты цыкоры закантрактаваны Белдзяржгандлем.

Засяваецца таксама 150 гэктараў цыбулі, пераважна, у саўгасах.

У Гомельскай акрузе Гомсадсаюз кантрактуе 3 млн. штук гуркоў для засолькі і 15 тысяч пуд. капусты для заквашаньня.

Упяршыню ў гэтым годзе, між іншым, засяваецца з прамысловай мэтай махорка. Пасевы праводзяцца ў колгасах, саўгасах і каапэраваных гаспадарках.

Горш усяго стаіць справа з разьвіцьцём гароднічтва ў калгасах і ў с.-г. каапэрацыі, наогул. Ні тыя і ні другія покуль што сур'ёзна гэтую праблему ня ставяць перад сабою. Па калгасах, напрыклад, плошча, пад гародніну летась займала 705 гэкт., сёлета яна займае 1.408 гэкт. Калі прыняць пад увагу вялізарны тэмп росту калгасаў, дык стане зразумела, што фактычна, нават і маленькага павялічэньня плошчы на кожны калгас няма.

Такое становішча тлумачыцца часткова слабай увагай с. г. каапэрацыі, якая да гэтага часу ня прымала (а таксама і сёлета) патрэбных мер да разьвіцьця каапэрацыйнага гароднічтва і арганізацыі каапэрацыйнага збыту прадуктаў гароднічтва.

Да сёлетняга году яшчэ збытам прадукцыі гароднічтва ніхто ў нас не займаецца. Калгасы амаль усю сваю прадукцыю збывалі на вольны рынак. Некаторыя з колгасаў, якія далёка знаходзяцца ад гарадзкіх цэнтраў, прымушаны былі, скарыстоўваць гародніну на харч жывёле. І гэта робіцца ў той час, калі гарадзкія цэнтры БССР адчуваюць востры недахоп у прадуктах гароднічтва.

Па ўсёй Беларусі існуе толькі адзін садова-гародні саюз у Гомельшчыне. Сёлета Белсельсаюз паставіў пытаньне аб арганізацыі яшчэ такіх 4-х саюзаў, але да практычнае справы ён так і не дайшоў.

Што датычыць нямногіх пярвічных каапэрацыйных садова-гародніх аб'яднаньняў, дык і яны знаходзяцца покуль што ў стадыі заняпаду.

Гаварыць аб значэньні разьвіцьця гароднічтва ня прыходзіцца. Усім вядомы той востры недахоп у гародніне, які адчуваюць гарадзкія і рабочыя цэнтры. Зусім зразумела, што да справы папярэньня плошчы пад агароды ў нас да гэтага часу яшчэ адносяцца ня досыць уважліва. Гэта трэба адкрыта прызнаць і чым хутчэй паправіць вялізную памылку. У даны момант гавары

НА БАРАЦЬБУ СА ШКОДНІКАМІ СЕЛЬСКАЕ ГАСПАДАРКІ

Саўгасы, калгасы і камуны—прымайце актыўны ўдзел у „двухтыднёвіку“ барацьбы са шкоднікамі

Вывучэньне шкоднікаў і барацьба з імі

На Беларусі мы маем спэцыяльную дасьледчую станцыю аховы расьлін ад шкоднікаў. Станцыя непасрэдна выступіла да вывучэньня шкоднікаў і выпрацоўкі мерапрыемстваў па змаганьні з імі. Ужо другі год станцыяй праводзіцца праца на абсьледваньні шкоднікаў сельска-гаспадарчых расьлін. Першы год такое працы паказаў, наколькі рэзнастойна і багата фаўна шкоднікаў. Выяўлены найбольш галоўныя ў эканалічным сэнсе шкоднікі і іх геаграфічнае распаўсюджаньне. У акругах арганізаваны чатыры наглядныя пункты, якія маюць на мэце сачыць за зьяўленьнем шкоднікаў, іх пашырэньнем, вывучэньне ў натуральных мясцовых умовах іх жыцьця і мер змаганьня. У сучасны момант пры станцыі арганізуецца сетка добраахвотных карэспандэнтаў, якія будуць прысылаць весткі аб зьяўленьні шкоднікаў на мясцох, сачыць за іх пашырэньнем.

Арганізацыя такой сеткі, якая павінна ахапіць усе куткі Беларусі, дасьць магчымасьць накіроўваць матар'яльныя сродкі ў тыя мясцовасьці, дзе гэта вымагаецца зьяўленьнем шкоднікаў.

У галіне правядзеньня практычных мерапрыемстваў мы маем у сучасны момант таксама некаторыя дасягненьні.

Існаваньне 17 перасовачных абозаў для правядзеньня практычных мер барацьбы са шкоднікамі і стварэньне кадру спэцыялістых-інструктароў у некаторых акругах дае адпаведныя вынікі. Так, паводле атрыманых вестак, у Менскай акрузе будзе пратручана ўсё насеньне; зробленую заяўку на некаторыя атруты прышлося павялічыць, бо яе не хапала і нават у некаторых выпадках насельніцтва за свае сродкі іх купляла.

Цэнтр. Саветам Асоавіяхіму былі арганізаваны пры станцыі аховы расьлін месячныя курсы па падрыхтоўцы тэхнікаў па барацьбе са шкоднікамі. Курсы скончыла 72 чалавекі, якія пры дапамозе акруговых і раённых саветаў Асоавіяхіму павінны арганізаваць атрады і быць першымі пачынальнікамі ў гэтай галіне. У сучасны момант пры ЦС арганізаваны спэцыяльны атрад, які мае мэтай праводзіць барацьбу з рознымі шкоднікамі. Актыўным працаўніком Асоавіяхіму, праф. Змачынскім, выпрацавана атрута супроць хатніх шкоднікаў; ужываньне гэтай атруты вельмі простае, ня шкоднае і таннае.

Але на гэтых дасягненьнях нельга спыняцца, бо шкоднікі ня сьпяць, яны робяць сваю справу і пры ўмовах іх жыцьця могуць зноў зьявіцца навальніцай на нашых палёх, садох і агародах. Трэба памятаць мінулыя гады масавага іх зьяўленьня і быць на варце.

Дзеля гэтага неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на дасьледчую справу, бо перад ёю стаяць вельмі адказныя задачы. Неабходна таксама павялічыць водпуск матар'яльных сродкаў, бо толькі ад рэальных мерапрыемстваў па змаганьні са шкоднікамі можна чакаць павялічэньня ўраджайнасьці.

М. ПІЛЬКО.

ПАЗБАВІМСЯ АД ВЯЛІКІХ ПАДАТКАЎ І СТРАТ

Наша сельская гаспадарка выплачвае шкоднікам вялікі падатак у выглядзе зьнішчанага збожжа, гародніны і г. д., пачынаючы в моманту сяўбы і да таго часу, калі селянін ссыпаў свой ураджай у сьвіран. Але ня лепш і са стратай ад шкоднікаў і ў нашай гарадзкой гаспадарцы. Страта ад шкоднікаў тут па разьмерах будзе ня ніжэйшая, чым і ў селяніна.

З адсутнасьцю падліку страт, якія наносяцца кожны год нашай гарадзкой гаспадарцы казюлькамі і грызунамі, цяжка ўстанавіць разьмеры шкоды, але-ж факты кажуць за тое, што тут ёсьць вялікія страты.

Пры правядзімых кожны год абсьледваньнях сховаў збожжа ў гарадох выяўляецца іх заражанасьць казюлькамі (клящамі), а грызуны настолькі моцна звялі там сабе гняздо, што не адна сотня пудоў хлеба зьнішчана імі. Прадукты, што адпускаюцца магазынамі МЦРК, як рыс, гарох, часта псуюцца рознымі шкоднікамі. А ў адным з заводаў МЦРК у вялікай колькасьці распаўсюджваўся адзін шкоднік, пад назвай «млынарская агнёўка», так што вусень яе можна спаткаць у печаным хлебе, а побач з гэтым не дзесяткі, а сотні пудоў мукі пажываюцца гэтымі шкоднікамі.

Хуткаму разбурэньню нашых пабудоў дапамагае дамавы грыбок, які шкодзіць драўніне. Жукам-тачыльшчыкам псуецца хатняя мэбля.

У садох, агародах, асабліва ў сучасны момант, у надта вялікай колькасьці зьявіліся розныя жучкі і чэрві, якія зьнішчаць значную колькасьць ураджаю.

Неабходнасьць правядзеньня работ па барацьбе са шкоднікамі зусім відавочна і да вырашэньня гэтае задачы ў наступны час прыступіў цэнтральны савет Асоавіяхіму, арганізаваўшы спэцыяльны атрад па барацьбе са шкоднікамі, у кола дзейнасьці якога і ўключаецца барацьба са шкоднікамі ў горадзе Менску. Посьпех у працы будзе залежаць ад таго, наколькі насельніцтва гораду, а таксама гаспадарчыя арганізацыі адгукнуцца на гэтую справу.

Такім чынам, мы як на вёсцы, так і ў горадзе захаваем тыя мільёны, якія зьнішчаюць амаль што няпрыкметныя шкоднікі.

ІІАЎЛАЎ.

Асоавіяхім—на дапамогу сельскай гаспадарцы

Барацьба за ўраджай—справа ўсіх працоўных. Таму зусім не выпадкова Саюзны савет Асоавіяхіму яшчэ зімою г. г. паставіў у пляне летняе работы правядзеньне тыдню на барацьбе са шкоднікамі ў сельскай гаспадарцы. Таксама не выпадкова цэнтральны савет беларускага Асоавіяхіму яшчэ ў сакавіку месяцы, апрача падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі, склікаў ўсебеларускія курсы для падрыхтоўкі тэхнікаў па барацьбе са шкоднікамі сельскае гаспадаркі, з разьліку па адным чалавеку на раён.

Гэтым Беласоавіяхім зрабіў пачатак практычнай рабоце арганізацый Асоавіяхіму ў галіне дапамогі сельскай гаспадарцы.

5-га мая прэзыдыум ЦС зацьвердзіў плян правядзеньня «двухтыднёвіка барацьбы са шкоднікамі сельскае гаспадаркі».

З прычыны таго, што акругі Беларусі некалькі адрозьніваюцца па сваіх кліматычных умовах, двухтыднёвік абвяшчаецца не адначасова па ўсёй Беларусі — у паўднёвых акругах некалькі раней, а ў паўночных—пазьней. Пэрыяд правядзеньня двухтыднёвіка па БССР вызначан з 26 мая па 1-га ліпеня.

У часе двухтыднёвіка мы павінны:

Шырока растлумачыць працоўным аб стратах, якія прыносяць нашай сельскай гаспадарцы шкоднікі, і мабілізаваць грамадзкую думку вакол гэтага пытаньня; правесьці, пры ўдзеле шырокіх мас сялянства, рад папераджальных мерапрыемстваў супроць шкоднікаў і барацьбу з імі, а таксама барацьбу з хатнімі чужаедамі; шырока разгарнуць практычныя работы па барацьбе са шкоднікамі палёў, саду, гароду і хатнімі, як непасрэдна праз ячэйкі Асоавіяхіму, так і праз арганізацыі асоавіяхімаўскіх атрадаў пры райсаветах, акрсаветах і цэнтральным савеце; папулярызаваць ідэі і задачы Асоавіяхіму і ўцягнуць новыя пласты працоўных у рады апошняга.

Мы павінны ў двухтыднёвік у першую чаргу завастрыць увагу ўсяго сялянства, усяе вясковае грамадзкасьці на пытаньні барацьбы са шкоднікамі сельскае гаспадаркі з тым, каб гэта ўвага і практычная работа ў гэтай галіне ня скончыла-б свайго існаваньня пасьля двухтыднёвіка, а была-б уведзена, як сыстэма.

Нашы нізавыя арганізацыі павінны на працягу двухтыднёвіка як мага шырэй скарыстаць спэцыяльныя атрады на чале з тэхнікамі, якія скончылі асоавіяхімаўскія курсы, а таксама агранамічныя сілы мясцовых зямельных органаў. Гэтыя атрады павінны быць арганізатарамі мас ня толькі ў момант двухтыднёвіка, але і на далейшы пэрыяд барацьбы са шкоднікамі.

Саўгасы, камуны, калгасы павінны зьявіцца асяродкам шырокага правядзеньня двухтыднёвіка па барацьбе са шкоднікамі ня толькі ў сябе, але і ў суседніх вёсках.

Сельска-гаспадарчыя школы і сельска-гаспадарчая акадэмія (Горкі) павінны кінуць усе лепшыя сілы на барацьбу за ўраджай у якасьці кіраўнічага актыву.

Ніводзін член Асоавіяхіму ня можа застацца бязудзельным у пэрыяд гэтае кампаніі.

Ячэйкі Асоавіяхіму гораду павінны будуць на лініі шэфства зьвязацца са сваімі падшэфнымі вясковымі ячэйкамі і таксама дапамагчы ў пасьпяховым правядзеньні кампаніі.

Толькі пры агульным удзеле ўсіх арганізацый і асобных членаў поеьпсх кампаніі будзе забясьпечан і дасьць канкрэтныя вынікі.

С. ДРЫЛЁНАК.

За 100% трыманьне аблігацый пазык на руках працоўных

ЗДАВАЙЦЕ КАЛЕКТЫЎНА АБЛІГАЦЫІ НА ХАВАНЬНЕ У БАНКАЎСКІЯ УСТАНОВЫ

Прафсаюзы і камісіі садзейнічаньня пазыкам павінны разгарнуць растлумачальную работу аб нямэтазгоднасьці продажу аблігацый

Ніхто не дапаможа, калі самі сабе не дапаможам

Для кожнага працоўнага зразумела, якое важнае значэньне мае ў наступны момант моцнае фінансавае становішча нашай краіны. Разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва і індустрыялізацыі пралетарскіх рэспублік патрабуе шмат грошай, якія могуць і павінны даць усе працоўныя ў выглядзе пазык і ўнясеньня сваіх лішкаў у касы ашчаднасьці. Во ніхто нам не дапаможа, калі мы самі сабе не дапаможам.

Аб гэтым шмат гаварылася і пісалася. Але для некаторых гэта аксіёма яшчэ патрабуе довадаў. Знаходзяцца яшчэ такія працаўнікі (праўда, адзінкі), якія ў пэрыяд кампаніі за падпіску на пазыку, мабыць, першымі на яе падпісаліся, і можа выклікалі яшчэ іншых, каб і яны пасьледвалі добраму прыкладу, але зараз, калі выплата за аблігацыі пазык па калектыўнай падпісцы хутка канчаецца, некаторыя датэрміновае выкупляюць свае аблігацыі і прадаюць іх зноў дзяржаве, гэтым самым нібы дэзэртыруючы з фронту індустрыялізацыі.

Для разгортваньня кампаніі за падпіску на пазыкі летась амаль ва ўсіх прадпрыемствах і ўстановах былі створаны камісіі садзейнічаньня. **Гэтыя камісіі павінны існаваць і цяпер,** бо ніхто іх не распускаў. Тым больш, што цяпер на камісіі садзейнічаньня ўскладаецца найбольш важная частка іх работы, **гэта работа па растлумачэньні недапушчальнасьці продажу аблігацый пазык.**

Як-жа працуюць камісіі садзейнічаньня?

Абсьледваньне 23-х калектываў членамі Менгарсавету паказала, што камісіі працуюць вельмі дрэнна, а пытаньне наконт трыманьня аблігацыі пазык на руках працоўных паогул нідзе ня ставіцца.

З 23-х камісій садзейнічаньня толькі 5 пасьля скапчэньня падпіскі на пазыку працягвалі сваю работу. Ставілі даклады аб трыманьні аблігацый на руках працоўных, асьвятлялі пытаньні аб пазыцы ў насьценгазэтах, хаця і невыстарчальна. У калектыве ЦК КП(б)В арганізаваны куток, у які сабраны ўсе матар'ялы па дзяржпазыцы. На заводзе «Камунар» і шчотачнай фабрыцы ўстаноўлены пэўныя гадзіны заняткаў камісіі садзейнічаньня. Асабліва добра пастаўлена работа камісіі на шчотачнай фабрыцы.

Па іншых 18-ці калектывах камісіі садзейнічаньня **зусім не працуюць.** У 9-ці ўстановах рабочыя і служачыя нават ня ведаюць аб існаваньні такой камісіі. У гутарках з рабочымі аб мэтах і задачах дзяржаўнай пазыкі члены Менгарсавету выявілі, **што многія рабочыя зусім ня ведаюць, на што патрэбны грошы дзяржаве.** Гэта даказвае, што камісіі садзейнічаньня **вельмі дрэнна правялі растлумачальную работу.**

Хто датэрмінова выкупляе аблігацыі

Па 23-х калектывах падпісаліся на пазыку 4.664 чалавекі на суму 327.080 руб. І вось выяўляецца, што ўжо на сёнешні дзень гэта падпіска зьменшана трымальнікамі **бяз уважлівых прычын** на 28.525 руб. Сюды ўваходзіць сума ў 705 руб., якая ўзята 21 трымальнікам **па ўважлівых прычынах** і датэрміновы выкуп 460 аблігацый на суму 1.750 руб., **якія выйгралі.**

Зараз паглядзім, хто варочае аблігацыі пазык ў дзяржаўную касу.

Як гэта ня дзіўна, на першым месцы з ліку моцных калектываў дзяржаўных устаноў аказаліся супрацоўнікі Дзяржбанку, якія столькі агітуюць за пазыку і, здаецца павінны былі служыць прыкладам для ўсіх іншых калектываў. Але гэта толькі здаецца. На справе, калектыў Дзяржбанку пасьпяшаўся тэрмінова выкупіць 50 проц. сваіх аблігацый.

Крыху адстаюць ад Дзяржбанку іншыя банкаўскія ўстановы. Як, напрыклад, калектыў Белкамунбанку выкупіў датэрмінова 29,1 проц. сваіх аблігацый, Белсельбанку—19 проц., Менсельскрэдыту—42 проц., крэдытнага бюро—23 проц.

Вось, як на справе робяць тыя, што, здаецца, павінны былі быць зацікаўленымі больш за ўсіх іншых служачых у 100 проц. трыманьні аблігацый пазык у сябе на руках. Сорам, таварышы, так рабіць нельга.

Выкупляюць і прадаюць

Чаму мы ўпэўнены, што ўсе тыя, хто выкупляе датэрмінова аблігацыі, прадае іх зноў дзяржаве? У гэтым нас пераконвае тое, што толькі за красавік банкаўскія ўстановы выдалі трымальнікам аблігацый пазык звыш 100 тысяч руб. пазычак за ўнесеныя аблігацыі. Гэта значыць, што з дзяржаўнай касы вернута працоўным звыш 100.000 руб., **якія вельмі патрэбны нашаму будаўніцтву.**

За банкаўскімі ўстановамі ідуць іншыя ўстановы: супрацоўнікі Донвугалю выкупілі свае аблігацыі па ўсе 100 проц., Цукратрэсту—на 100 проц., Продасілікату—на 42 проц., будаўнічы аддзел Гандальбуду—100 проц., менскае аддзяленьне Белдзяржбуду—38,6 проц., па ЖАКТ'ах № 7 і 9—усе 100 проц., па ЖАКТ'е № 10—23,3 проц., Белжылсаюзе—20,3 проц., па Гандальбудзе—20,6 проц., па Белдзярвыдавецтве—16,6 проц., па «Эльводзе»—15,3 проц., ТЭЖЭ—15 проц., прыгарадны сельсавет—72 проц. і г. д.

Больш ненадзейнымі аказаліся арцелі Сампрамсаюзу. Арцелі—«Перамога», «Упакгруз», «Трудзеркало», «Жемчужина», «Косьтрог»—усе выкупілі свае аблігацыі па 100 проц., арцель «Спартак»—на 98 проц., арцель «Змычка»—на 80 проц., арцель «Метроінструмент»—на 65 проц.

Што чуваць на прадпрыемствах

На жаль члены Менгарсавету абсьледавалі вельмі нязначную колькасьць прадпрыемстваў. Але па некаторых даных можна зрабіць вывады, **што па прадпрыемствах дэтэрміновы выкуп аблігацый дае значна меншы процант.** З тых прадпрыемстваў, якія былі абсьледаваны, напрыклад, па Эльводзе, мы маем 15,3 проц. датэрміновага выкупу. У працкалектыве пекараў—каля 25 проц.

Але-ж і гэта далёка ненармальна. Таму грамадзкія арганізацыі, у першую чаргу **прафсаюзы,** павінны разгарнуць вялікую растлумачальную работу аб шкоднасьці выкупу аблігацый пазык і продажу іх зноў дзяржаўнай касе.

Такую дырэктыву даў прэзыдыум ЦСПСВ у спэцыяльным дырэктыўным лісьце, а таксама на апошнім сваім пасяджэньні.

Прафсаюзы і фабзаўкомы павінны зараз-жа пачаць гэту кампанію, скарыстоўваючы для гэтага ўсе формы палітыка-асьветнай і культурнай масавай работы. Аб тым, як гэта работа будзе праведзена, будзе сьведчыць агульная сума грошай, якая застанецца ў дзяржаўнай касе ў бліжэйшыя месяцы.

Агітацыя павінна весьціся пад лёзунгамі—**100 проц. трыманьня пазык на руках трымальнікаў і калектыўнай здачы аблігацый пазык на хаванье ў банкаўскія ўстановы або касы ашчаднасьці.**

П.

Бярэце прыклад з газэты „Гута“

Друкаваная газэта заводу імя Дамбаля «Гута» дае прыклад, як трэба весьці кампанію за ўтрыманьне аблігацый пазык на руках рабочых.

Пасьля артыкулу, які растлумачвае мэты і задачы дзяржаўных пазык, газэта падае сьпіс дэзэртыраў фронту сацыялістычнага будаўніцтва», у якім значыцца 11 прозьвішч рабочых заводу, прадаўшых свае аблігацыі.

І трэба сказаць, што газэта б'е трывогу **не дарэмна.** 11 рабочых прадалі свае аблігацыі на агульную суму 1.475 руб. што складае на кожнага звыш 134 руб.

Нехай іншыя друкаваныя насьценныя газэты таксама павядуць барацьбу за ўтрыманьне аблігацый пазык.

Энтузіясты сацыялістычнага спаборніцтва

Вучэцеся ад гомельскіх шчаціншчыкаў

Рабочыя гомельскай шчаціннай фабрыкі падвялі вынікі месячнай работы пад знакам сацыялістычнага спаборніцтва.

Толькі за адзін месяц вязальшчыкі кітайскай шчаціны зрабілі тое, чаго чакала ад іх фабрыка на працягу паўтара год. Яны перайшлі на зьдзельнічыну і павысілі прадукцыйнасьць працы на 20 проц.

Толькі за месяц упакоўшчыцы даказалі, што яны ўмеюць працаваць. І яны пачалі вырабляць у дзьвёх столькі, колькі раней выраблялі ў чатырох.

Палепшылася сартыроўка, павялічылася колькасьць добрай прадукцыі, зьменшыўся гдум на 4 проц. Дзякуючы гэтаму прадпрыемства з'эканоміла некалькі тысяч рублёў.

Наогул, прадукцыйнасьць працы ўзьнялася **на 8 проц.** Нечаканая лічба! Бо Гомельскай фабрыцы было дана заданьне павысіць прадукцыйнасьць працы толькі на 4½%. Гомельская фабрыка абавязалася павысіць прадукцыйнасьць працы на 6 проц., але павысіла на 8 проц.

8 проц., г. зн. **75.000 руб. эканоміі ў год.** Вось канкрэтны вынік спаборніцтва.

Гэтыя вынікі атрымаліся таму, што добра была праведзена растлумачальная работа сярод рабочых. За адзін толькі месяц выпушчана было 5 нумароў насьценгазэты. Рабкораўскі актыў павялічыўся з 18 чалавек да 35. Штаб спаборніцтва бясьперабойна пасылаў групы рацыяналізатараў на лятучыя абсьледваньні, даваў парады, вёў барацьбу з прагульшчыкамі. Раней на фабрыцы прагулы складалі 8 проц. усяго рабочага часу. А за апошні месяц рабочыя прагулялі толькі 9 гадзін і 40 хвілін. Рабочыя, якія пападалі ў сьпіс прагульшчыкаў, сумныя бегалі ў штаб і прасілі, каб далі ім магчымасьць паправіцца. Звольнены прагульшчык, як быў прыняты зноў на работу, пачаў працаваць так, як усе, стараючыся загладзіць сваю віну.

К. Л.

Добраахвотна зьніжаюць расцэнкі

Найбольш перадавыя рабочыя Гомельскіх галоўных чыгуначных майстэрань зразумелі, што для зьніжэньня сабекошту прадукцыі можна пайсьці на некаторыя ахвяры.

Так, у ліцейным цэху таварышы Улі-цін і Кабашнікаў добраахвотна зьнізілі свае расцэнкі на 20 проц. У калёсным цэху т. т. Цытовіч і Шклярэнка зьнізілі сабе расцэнкі на 16 проц.

У мэханічным цэху стварылася ініцыятыўная група з 15 чалавек, якая паставіла сабе мэтай зьнізіць расцэнкі, паменшыць сабекошт прадукцыі і ліквідаваць прагулы.

К. Н.

Першыя вынікі на лесазаводзе „Калектыўная Праца“

Рабочыя заводу «Калектыўная Праца» (Гом. акругі), выступаючы на сацыялістычнае спаборніцтва з лесазаводам «Камінтэрн» у Барысаве, паставілі сабе мэтай выканаць вытворчую праграму на 100 проц., узьняць прадукцыйнасьць працы на бачарным і стружачным цэхах на 20 проц., лесапільным—на 18 проц. і зьнізіць сабекошт прадукцыі на 8 проц.

Першы месяц спаборніцтва даў значныя вынікі. У лесапільным цэху вытворчая праграма выканана на 103 проц., у бачарным цэху—на 108 проц., у стружачным цэху—на 128,86 проц.

Прадукцыйнасьць працы ў параўнаньні з другім кварталам мінулага году ўзьнялася ў лесапільным цэху на 12 проц., у бачарным—на 11,66 проц., у стружачным—на 56 проц.

Ініцыятары спаборніцтва—камсамольцы стружачага цэху—паказалі прыклад сьвядомых адносін да вытворчасьці і **добраахвотна скарацілі лік рабочых па канцарэзкі на аднаго чалавека,** загрузіўшы тым самым свой 8-мігадзінны працоўны дзень. У мінулым годзе адну зьмену абслугоўвалі тры чалавекі, у гэтым годзе тры чалавекі абслугоўваюць дзьве зьмены.

Прагулы па няўважлівых прычынах значна зьменшыліся. У сакавіку было 16 чалавека-дзён, у красавіку—9 чалавека-дзён.

Гэтыя вынікі дасягнуты пры ўдзеле толькі найбольш актыўнай часткі калектыву. Калі ўвесь калектыў будзе ахоплены спаборніцтвам, тады можна чакаць значна большых вынікаў.

Мясцовым арганізацыям патрэбна прыняць усе меры, каб узьняць энтузіязм усіх рабочых заводу і дапамагчы выйсьці пераможцамі ў сацыялістычным спаборніцтве.

Ф. М.

Хто каго выклікае

⊙ Рабочыя цьвіковага **заводу «Чырвоны Кастрычнік»** прынялі выклік «Чырвонага Мэталіста» і «Камінтэрну» і ў сваю чаргу выклікалі на спаборніцтва **рабочых заводу «Інтэрнацыянал»** у Рэчыцы і с.-г., арцель «Чырвоны Кастрычнік» у саўгасе «Усьце». Рабочыя паставілі сабе задачу выканаць дырэктыву ўраду аб зьніжэньні сабекошту прадукцыі на 7 проц. і ўзьняць прадукцыйнасьць працы на 17 проц.

⊙ Калектыў **транспартнага спажывецкага таварыства на станцыі Ворша** выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва калектыў ТСТ станцыі Менск. Аршанскія таварышы запрасілі прадстаўнікоў з Менску для падпісаньня дагавору.

⊙ Калектыў служачых **Аршанскага акрфа** прыняў выклік Магілеўскага акрфа і ў сваю чаргу выклікаў Віцебскі акрфа.

Сацыялістычнае спаборніцтва на весьці

Не падменьвайце спаборніцтва парадным пустазвонам

Толькі па канкрэтных выніках можна меркаваць аб посьпехах

Ня выконваюць узятых на сябе абавязкаў

Саўгас Рудня-Астравітая, Чэрвеньскага раёну, Менскае акругі, выклікаў на спаборніцтва па падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой пасёўнай кампаніі саўгас Наталаўск гэтага-ж раёну.

Падрыхтоўка ў абодвых саўгасах праводзілася добра ў сэнсе рамонту сельска-гаспадарчых машын, а калі ўзяць цягавую сілу, дык у Наталаўску справа куды лепш, бо коні ў Наталаўску разьмеркаваны і прымацаваны да сталых рабочых і даглядаюцца добра. У Рудні-Астравітай за конькі ня было належнага догляду. **Саўгас Рудня-Астравітая ўзяўся павысіць ураджайнасьць на 25 проц.,** а ворыва праводзіцца рабочымі кепска, з урэхамі. Зараз засеяна толькі 5 гэктараў бульбы.

Рабочы калектыў Наталаўску паставіў сваёй задачай **падняць ураджайнасьць на 20 проц., прадукцыйнасьць працы на 20 проц.,** зьнізіць сабекошт на 7 проц., а таксама і накладныя выдаткі. Гэта ўсё ўжо і праводзіцца. Напрыклад, на лесапільным заводзе ўжо павялічылася прадукцыйнасьць працы, па вывазцы гною прадукцыйнасьць працы павялічылася на 25 проц. Пасеў у Наталаўску скончыцца прыблізна праз тыдзень. Калектыў рабочых вельмі актыўна працуе.

А. М.

Выканаем дырэктыву ўраду аб арганізацыі буйных калгасаў

Адначасова з калгасамі, камунамі і арцелямі ў сацыялістычным спаборніцтве на вёсцы павінны прыняць удзел і акруговыя саюзы калгасаў БССР.

Галоўнай мэтай сацыялістычнага спаборніцтва паміж калгассаюзамі павінна стаць наступнае:

Выкананьне пляну калектывізацыі ў гэтым годзе ня толькі па колькасьці арганізуемых адзінак, а таксама і па плошчы зямлі, аб'яднанай гэтымі адзінкамі.

Ня трэба забываць, што да апошняга часу дырэктыва ўраду аб тым, каб сярэдняя плошча зямлі нанава арганізаваных калгасаў па БССР была ня менш 140 гэктараў,—па акругах ня выканана, **за выключэньнем Гомельскай, Мазырскай і Бабруйскай.**

Трэба, каб астатнія акркалгассаюзы падцягнуліся.

У часе спаборніцтва калгассаюзы павінны паставіць задачай ня толькі выканаць дырэктыву ўраду, але і значна перавысіць сярэднюю норму ў 140 гэктараў.

Другая задача **арганізацыя буйных калгасаў і ўзбуйненьне існуючых** як за кошт зьліцьця дробных сумежных калгасаў у адзін, так і за кошт далучэньня да калгасаў вакольных сялянскіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Вырашэньне гэтай вялізарнай задачы павінна зрабіць карэнны пералом у справе калектывізацыі і памеціць новыя шляхі, якія павядуць нашу вёску да сацыялізму больш шпаркімі крокамі.

Намечаныя пляны арганізацыі буйных калгасаў амаль што зрываюцца. Цэлы рад акруг зусім не з'арганізаваў ніводнага буйнога калгасу.

У спаборніцтва калгассаюзаў павінна стаць задача **мабілізаваць усю грамадзкасьць, усю калектыўную думку як вёскі, таксама і гораду навакол пытаньняў арганізацыі буйных калгасаў.**

Сацыялістычнае спаборніцтва зьяўляецца магутным сродкам выканаць

Саўгасы павінны падрыхтавацца да асеньняй с.-г. кампаніі

Веснавая сяўба падыходзіць да канца. Папярэднія вынікі падрыхтоўкі сьведчаць аб значных посьпехах у выкананьні задач, пастаўленых перад саўгасамі партыяй і ўрадам.

У паход ва ўраджай саўгасы выйшлі з большай колькасьцю штучных угнаеньняў (2.376 тон—на 406 проц. больш мінулага году). Сабралі 1.090 тон попелу, у асноўным сеюць авёс і ячмень гатунковым насеньнем. У большай меры рыхтуюцца скарыстоўваць вынікі прац дасьледчых станцый. Пачаў працаваць беларускі гігант на балоце--саўгас «імя дзесяцігодзьдзя БССР». Непараўнальна з мінулым разгарнулася агравытворчая дапамога бядняцка-серадняцкаму селянству. Саўгасамі перадана сельска - гаспадарчай каапэрацыі і абменена насельніцтву 5.220 тон гатунковага і палепшанага насеньня. У саўгасах арганізаваны 33 рамонтныя майстэрні—усяго адрамантавана 1.500 шт. сялянскага інвэнтару. Працуе цэнтральная і перасовачная трактарная майстэрні. На злучпунктах працуе 136 жарабцоў, 270 бугаёў і 146 кныроў. Адсартавана 10.530 тон сялянскага насеньня—амаль у тры разы больш, чым за ўвесь 1928 г.

Сяўба ў саўгасах праходзіць пры значна ажыўленай працы вытворчых нарад. Аднак, праверка падрыхтоўкі выяўляла шмат саўгасаў, ня вытрымаўшых экзамэну. Позна атрыманы дырэктывы. Недапушчальна павольна раскачваліся ўнізе.

Шмат дзе рыхтаваліся пры фармальным удзеле рабачкомаў і вытворчых нарад—у большасьці саўгасаў ня было талковага каляндарнага пляну. Падрыхтоўка да кампаніі не ахапляла ўсіх асноўных задач. Зусім слабая ўвага праяўлена да павышэньня прадукцыйнасьці жывёлы і другіх галін гаспадаркі. **Зьніжэньне сабекошту прадукцыі і палепшэньня арганізацыі працы, найбольш слаба падрыхтаваныя зьвеньні кампаніі, у большасьці саўгасаў зусім не прапрацоўвалася.**

Ня ўсюды на справе прыняты курс усебаковай дапамогі калектывізацыі і ўздыму прадукцыйнасьці бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Слабы ўдзел саўгасаў у кантрактацыі; згнойваньне вікі ў саўгасе імя дзесяцігодзьдзя, лубіну ў Дойнічаве і інш.—зьнішчэньне ўсхожасьці гатунковага насеньня ў радзе саўгасаў—вынік ня толькі дрэнных кліматычных умоў мінулага году, **але і вынік злачынна нядбайнага безгаспадарчага захоўваньня насеньня і дрэннай абсталяванасьці саўгасаў.** Крымінальная справай зьяўляецца пераклідка непадрыхтаванага насеньня саўгасам Уваравічы і інш. Безгаспадарчае захоўваньне машын—гэта пасьведчаньне большасьці саўгасаў.

Асноўным рашаючым вынікам зьяўляецца ступень актыўнасьці ўдзелу і кантролю саміх мас рабочых над гэтымі задачамі. Там дзе актыўна працавалі вытворчыя нарады, дзе самаахвярна разам усе ажыцьцяўляюць рашэньні іх на справе, там ёсьць буйнейшыя посьпехі.

Улічваючы недахопы веснавой сяўбы, безадкладна трэба рыхтавацца да асеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі.

Пад гатунковымі пасевамі трэба заняць увесь азімы клін у 7.794 гэктар. (пашырэньне на 70 проц.), пашырыць пасеў пшаніцы з 296 да 500 гэкт. і на 71 гэктар. азімай вікі. Забясьпечыць уздым ураджайнасьці на 18 проц. у параўнаньні з запраектаваным на 1929 год і зьнізіць сабекошт прадукцыі ня менш, як на 15 проц. Ужыць рад мер па ўздыме жывёлагадоўлі (сілосы, палянішэньне сенажацяй і інш.). Не паслабіць, а наадварот пашырыць дапамогу і ўплыў саўгасаў на вёсцы. Своячасова і добраякасна правесьці ўборачную кампанію і, нарэшце, падрыхтоўку да веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі 1930 г. Гэта—асноўныя задачы.

* * *

Намечаныя па пляне арганізацыі 80 вытворчых аб'яднаньняў і ўзмацненьне саўгасаў, атыстка 3.500 тон сялянскага збожжа, рамонт 1.500 шт. інвэнтару, перадача на карыстаньне інвэнтару саўгасаў, апрацоўка глебы бяднейшаму сялянству—патрабуюць бездакладнага агравытворчага шэфства над т-вамі, пасёлкамі, вёскамі—растлумачэньня і арганізацыі практычнага выкананьня гэтых задач

Падрыхтаваць меры пашырэньня плошчы на 7 процантаў у пасеўную кампанію 1930 году — лушчэньне пожні на плошчы ў 100 процантаў азімага кліну без падсеўных культур, як значнага сродку ўздыму ўраджайнасьці 100 проц. ворыва на вяб, падрыхтоўка закладкі штучных выпасаў у 88 саўгасаў, вапнаваньне на плошчы 4.635 гэк.,—асноўныя меры, якія павінны быць выкананы своячасова, якія дапамогуць паходу ва ўраджай.

Гэтыя асноўныя практычныя задачы павінны быць канкрэтызаваны на кожным саўгасе ў сацыялістычным спаборніцтве.

Яны могуць быць выкананы пасьпяхова толькі тады, калі вытворчыя нарады стануць на чале ўсіх асноўных і дэтальных задач саўгасаў, калі будзе ўзрастаць прадукцыйнасьць і якасьць працы—яшчэ больш узьнімецца працоўная дысцыпліна.

Сацыялістычнае спаборніцтва—падважнік хутчэйшага сацыялістычнага будаўніцтва, ім павінны аўладаць шырокія масы рабочых.

Т. АЎЧЫНЬНІКАЎ.

З кім ісьці бедняку і серадняку

Раздробленасьць гаспадарак, вузкапалосіца, нізкатэхнічнасьць і засьмечанасьць насеньня, адсталыя сельгаспрылады, амаль поўная адсутнасьць угнаеньняў, бясконнасьць і бязінвэнтарнасьць—вось што перашкаджае разьвіцьцю сельскае гаспадаркі. Дзе і ў чым выхад з гэтага становішча. Якія сілы могуць разарваць ланцуг векавое адсталасьці і галечы сельскае гаспадаркі.

— Выхад знойдзен—крычаць кулакі і заможныя элементы сялянства. Раней душыў нас памешчык, цяпер яго няма. Мы плацілі раней арэнду, цяпер карыстаемся зямлёю дарма. Дык дайце-ж нам свабодна разьвіваць сваю гаспадарку, ня ўмешвайцеся ў нашу жыцьцё, не абмяжоўвайце наша разьвіцьцё і мы пераможам беднасьць нашых палёў. Свабода найму рабочае сілы, свабода і неабмежаванае пашырэньне зямельных уладаньняў, свабода таваразвароту—вось у чым выхад па думцы капіталістычных элемэнтаў вёскі.

Ці праўда гэта? Ці праўда, што калі даць свабоду разьвіцьця, дык гэтым самым будуць зьнішчаны ўсе перашкоды на шляху сельскае гаспадаркі. Прыклады свабоднага разьвіцьця сялянскіх гаспадарак ва ўсіх краінах Эўропы абвяргаюць гэтае сьцьвярджэньне. І сама гэта «свабода», свабода ў двукосьсі, ёсьць толькі свабода для кулацкіх гаспадарак эксплёатаваць бядняцкія гаспадаркі і разбурваць серадняцкія. На працягу стагодзьдзяў цэлым радам краін паказана, што так званае свабоднае разьвіцьцё прыводзіць да разбурэньня бядняцка-серадняцкіх мас і да ўзбагачэньня невялікай кучкі кулацкіх гаспадарак. Гэты шлях разьвіцьця—ёсьць капіталістычны шлях разьвіцьця сельскае гаспадаркі.

Пры такім капіталістычным шляху разьвіцьця вёскі сапраўды і жывёла палянішаецца і ўгнаеньня кладзецца больш і сельгасмашыны лепшыя. Але ў каго гэта так робіцца? Ды толькі ў невялічкай капіталістычнай часткі вёскі за кошт разбурэньня і абядненьня рэшты бядняцка-серадняцкай масы. Усе апосталы капіталізму здаўна хвалілі Данію, маленькую зямляробчую краіну, дзе нібы пануе дабрабыт і багацьце на ўсіх пластох вёскі. А між тым «свабода» для сялян Даніі прывяла іх да таго-ж самага выніку, што і сялян Расіі перад рэвалюцыяй 1917 г.

Яшчэ задоўга да вайны становішча «свабоднага» дацкага селяніна было наступным. Кулацкія гаспадаркі, які складалі ўсяго ¹/₉ частку ўсіх гаспадарак. мелі 62 проц. усёй сялянскай зямлі, у той час, як 72 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, г. зн. амаль ³/

НОВЫЯ ФОРМЫ РАБОТЫ НА БІРЖЫ ПРАЦЫ

Стварается інстытут прадстаўнікоў беспрацоўных, якія будуць наглядаць за пасылкай на работу, дапамагаць біржы працы змагацца з пратэкцыянізмам і няправільнымі адказамі ў прыёме на работу і г. д.

Для паляпшэньня работы бірж працы, узмацненьня барацьбы з бюракратызмам і злоўжываньнямі ў работе бірж працы і для ўзмацненьня дысцыпліны сярод беспрацоўных прэзыдыум ЦСПСБ, у адпаведнасьці з пастановай 8-га зьезду прафсаюзу, устанавіў новыя формы ўдзелу беспрацоўных у работе бірж працы.

Агульныя сходы беспрацоўных, якія зарэгістраваны на біржы працы, **абіраюць сваіх прадстаўнікоў** з ліку беспрацоўных **членаў саюзу**. Колькасьць беспрацоўных, якая павінна быць абрана на кожным саюзе, устанаўляецца адпаведным акрпрафбюро (у Менску АТЭ ЦСПСБ) сумесна з інспэкцыяй працы з такім разьлікам, каб агульная колькасьць прадстаўнікоў беспрацоўных па асобных сэкцыях бірж працы складала ад 7 да 11 чалавек.

Прадстаўнікі беспрацоўных абіраюцца тэрмінам **на 3 месяцы**. У выпадку пасылкі прадстаўніка беспрацоўных на часовую работу тэрмінам да 1-го месяца, ён захоўвае за сабой правы прадстаўніка беспрацоўных да сканчэньня тэрміну паўнамоцтва ўсёй абранай групы. У выпадку паступленьня прадстаўніка беспрацоўных на пастаянную работу, ён лічыцца выбыўшым і на яго месца на бліжэйшым сходзе беспрацоўных выбіраецца другі прадстаўнік.

У абавязкі прадстаўнікоў беспрацоўных уваходзіць: **штодзенны нагляд за пасылкай на работу, удзел у спэцыяльных праверках і ўстанаўленьні агульнага парадку выклікі беспрацоўных, нагляд за папярэднім адборам на пасылку на грамадзкія работы, у працакалентывы і на курсы перакваліфікацыі беспрацоўных, нагляд за апэрацыямі бірж працы** (рэгістрацыяй, зьняцьцем з вучоту і г. д.), **дапамога біржам працы ў барацьбе з пратэкцыянізмам і няправільным адказам устаноў у прыёме на работу, удзел у абсьледваньнях матар'яльнага становішча беспрацоўных і ў камісіях па разглядзе скаргаў беспрацоўных.**

На выбраных ускладаюцца таксама грамадзкія абавязкі па правядзеньні правіл унутранога распарадку на біржы працы, па барацьбе з хуліганствам, нагляду за санітарным станоўішчам бірж працы, за работай чырвоных куткоў і ўсёй культасьветнай работай бірж.

Прадстаўнікі беспрацоўных ня могуць умешвацца ў апэрацыйныя работы бірж працы, ня могуць даваць якія-небудзь паказаньні асобным работнікам бірж працы, і скасоўваць іх распараджэньні. У выпадку заўважаных недахопаў і несправядлівасьцяй у работе апарату бірж працы, прадстаўнікі беспрацоўных павінны зварачацца да загадчыка сэкцыі і, калі гэта невыстарчальна,—да загадчыка біржай, у камітэт біржы або ў праўленьне саюзу.

Прадстаўнікі беспрацоўных па кожным саюзе склікаюцца пэрыядычна праўленьнем саюзу для абмену практыкай і для інструктаваньня. Акрамя таго выбраныя павінны рабіць справаздачы аб сваёй рабоце перад адпаведнымі саюзамі і на сходах беспрацоўных.

Прадстаўнікі беспрацоўных выбіраюць двух прадстаўнікоў у камітэт біржы працы **на правох членаў камітэту** таксама на 3-хмесячны тэрмін. Склікае сходы вылучаных прадстаўнікоў ў біржавы камітэт акрпрафбюро, а ў Менску АТЭ ЦСПСБ.

Выконваюць прадстаўнікі беспрацоўных свае абавязкі, як правіла, у парадку **грамадзкай работы**. Аднак, за работу што выконваецца па-за біржай працы (абсьледваньне беспрацоўных, праверка прыёму на работу і г. д.), выбраныя могуць атрымаць плату.

Д.

Перад прызывам

Каму даюцца адтэрміноўкі

Сьпісы навучальных устаноў, вучням якіх даюцца адтэрміноўкі прызыву разасланы на месцы і ёсьць у кожным ваенкамаце, у кожнай прызыўнай камісіі. Кожны вучань, які хоча ведаць, ці карыстаецца ён правам на адтэрміноўку прызыву, можа атрымаць аб гэтым дакладную спраўку у любым ваенкамаце.

Што-ж датычыць адтэрмінованьняў асобам, якія скончылі навучальныя установы і адбываюць стаж, дык згодна растлумачэньня Наркамваенмора адтэрміноўка прызыву даецца толькі тым стажорам, якія пасылаюцца на стаж у вызначаным парадку праз органы Наркампрацы. Асобам, якія скончылі навучальныя ўстановы і стажуюць—працуюць непасрэдна, паміма органаў Наркампрацы, адтэрміноўка прызыву не даецца.

Адтэрміноўкі прызыву даюцца вучням

На які тэрмін даюцца адтэрміноўкі

Адтэрміноўкі прызыву даюцца вучням да дасягненьня імі пэўнага ўзросту, а іменна, вучні школ II-й ступені (дзевяцігодак), карыстаюцца адтэрміноўкаю да 23 год, вучні рабфакаў і тэхнікумаў—да 25 год, вышэйшых навучальных устаноў—да 28 год.

Для тых вучняў, якія паступілі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы па скончэньні рабфакаў, а таксама для вучняў пэдагагічных курсаў, умовамі паступленьня ў якія зьяўляецца сканчэньне вышэйшых навучальных устаноў, гранічны ўзрост вызначан у 30 год.

Для вучняў у транспартных прафэсыянальных школах стажораў-рабочых гранічны ўзрост атрыманьня адтэрміноўкі прызыву—25 год.

Тым вучням рабфакаў і тэхнікумаў, якія, ня гледзячы на дасягнуты імі 25-гадовы ўзрост, не пасьпелі да часу прызыву закончыць сваёй асьветы, дазволена даваць дадатковыя адтэрміноўкі, але не далей гранічнаму ўзросту, вызначанага для вучняў вышэйшых навучальных устаноў.

Апрача паказаных навучальных устаноў (ВНУ, тэхнікумы, школы II-й ступені, рабфакі), ёсьць яшчэ цэлы рад так званых нятыповых навучальных устаноў. Вучням нятыповых навучальных устаноў адтэрміноўка прызыву даецца на тэрмін працягам курсу з прыбаўленьнем аднаго ільготнага году. Напрыклад, калі курс якой-небудзь навучальнай установы разьлічаны на 3 гады, вучань гэтае навучальнае ўстановы можа карыстацца адтэрміноўкаю на працягу 4 год. Аднак, адтэрміноўка прызыву вучням нятыповых навучальных устаноў ня можа давацца далей гранічнага тэрміну, вызначанага для далейшых навучальных устаноў.

Калі вучні ня мелі магчымасьці займацца рэгулярнымі заняткамі у навучальных установах з прычыны выкананьня імі тых ці іншых абавязкаў, ускладзенных на іх дзяржавай, партыйнымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі, ім могуць давацца дадатковыя адтэрміноўкі, але не далей 30 гадовага ўзросту.

МЕНСК

Усебеларускі зьлёт піянэраў

Калегія Наркамасьветы пастанавіла правесьці в 1-га чэрвеня па 1-га жніўня раённыя і ўсебеларускі зьлёты піянэраў. Задачы зьлёту: ўзьняць палітычную актыўнасьць піянэраў і ўсіх дзяцей працоўных, прыцягнуць увагу шырокай грамадзкасьці да здавальненьня патрабаваньняў дзяцей па выхаваньні іх у камуністычным духу, уцягненьня ў рады піянэраў новай масы дзяцей працоўных.

Зьлётам будуць ахоплены ня толькі піянэры-школьнікі, але і ўвесь склад неарганізаваных школьнікаў.

Калегія Наркамасьветы запрапанавала ўсім інспэктарыятам прадставіць дармова інтэрнаты школ, тэхнікумаў, і іншых культасьветных і навучальных устаноў у канікулярны час для наладжаньня дзіцячых конкурсаў, выставак і разьмяшчэньня дэлегатаў зьлётаў. Дэлегаты зьлётаў будуць таксама дармова абслугоўвацца кіно, летнімі тэатрамі і інш.

На пабудова трамваю

Згодна пляну трамвайнага кіраўніцтва, пракладка трамвайных рэяк па ўсёй Савецкай і Нова-Бабруйскай вуліцах скончаецца да 15 ліпеня. 5-га ліпеня пачнецца пракладка рэяк па Доўгабродзкай вул. з тым, каб скончыць работу 20-га ліпеня. З 15-га ліпеня па 5-е жніўня работа будзе праводзіцца па вуліцах Ленінскай, Энгельса і на Пляцы Волі. У гэты-ж час пачнецца пляніроўка вуліц. Да 1-га верасьня будзе скончана абсталяваньне паветраных ліній па ўсіх вуліцах, дзе пракладваюцца трамвайныя рэйкі. Новы мост праз раку Сьвіслач павінен быць скончаны ў канцы жніўня.

Уключэньне абанэнтаў у новую вадаправодную магістраль

З прычыны пераабсталяваньня вадаправоднай магістралі па Савецкай і Ленінскай вуліцах, якая была праложана 60 год таму назад, прэзыдыум гарсавету запрапанаваў Эльводу абвяшчаць усім абанэнтам, каб яны ў тэрміновым парадку ўключыліся ў новую магістраль. Праз некаторы час старая магістраль будзе закрыта.

З-гадовы юбілей літаратурна-мастацкага згуртаваньня „Ўзвышша“

Сёньня спаўняецца тры гады з часу заснаваньня беларускага літаратурна-мастацкага згуртаваньня «Ўзвышша».

Згуртаваньне «Ўзвыша», яднае наступных паэтаў, пісьменьнікаў і крытыкаў: К. Чорны, Ул. Дубоўка, З. Бядуля, А. Бабарэка, Я. Пушча, Ф. Купцэвіч, Ул. Жылка, П. Глебка, С. Дарожны, М. Лужанін, Амт. Адамовіч, Шашалевіч і інш.

Згуртаваньне выдае часопісь «Ўзвышша».

У дні юбілею мае адбыцца агульны сход згуртаваньня ў доме Пісьменьніка, на якім будуць зроблены даклады аб 3-гадовай працы згуртаваньня.

Ільготы сэзоньнікам

Усебеларуская кантора Дзяржбанку разам з Галоўнай Касай Ашчаднасьці пачала праводзіць шырокую агітацыйную работу сярод сэзоньнікаў. Выпушчана спэцыяльная лістоўка. Абсталяваны «Куткі трымальнікаў дзяржпазык» у інтэрнатах сэзоньнікаў пры Белдзяржстрої і на торпараспрацоўках у Тучынках. Сэзоньнікі будуць абслугоўвацца кіно-перасоўкай Дзяржбанку. Адкрываюцца агэнцтвы касы ашчаднасьці на пабудове унівэрсытэцкага гарадка і іншых пабудовах. Каб даць магчымасьць сэзоньнікам набыць аблігацыі пазык, Дзяржбанк і каса ашчаднасьці ўстанавілі растэрміноўку платы для сэзоньнікаў на працягу ўсяго перыяду іх работы—да 5 месяцаў. Пры групкомах будаўнікоў утвараецца спэцыяльны інстытут упаўнаважаных па пазыках.

За дзень

ГУЛЬНІ Ў ФУТБОЛ, БАСКЕТБОЛ І ВАЛЕЙБОЛ. У нядзелю, на спортплядоўцы саду «Прафінтэрн» адбудуцца таварыскія спатканьні па футболе паміж камандамі друкароў і мэталістых, аўта-бронедывізіёну і камандай БДУ. Па баскетболе паміж камандамі КІМ і РКХ. Па валейболе каманды тэкстыльшчыкаў і будаўнікоў.

ЭКСКУРСІЯ ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ. Фізкультурны гурток МБЕ ж. д. супольна з саюзам арганізуе заўтра маёўку-экскурсію за горад, дзе будуць наладжаны масавыя спартыўныя гульні, спатканьні па футболе і г. д.

— УЦЁК КАСІР ЦАГЕЛЬНІ № 8. З Менску ўцёк касір цагельні № 8 Белдзяржстрою **Чаган**, захапіўшы да 9 тысяч руб. У панядзелак, 20 мая, **Чаган** па чэках атрымаў гэтыя грошы ў Дзяржбанку і Белдзяржстрою для расплаты з рабочымі, але ён на завод ня прышоў і ўцёк невядома куды. Крымвышук прыняў рашучыя меры да затрыманьня злачынцы.

— ВЫЙГРЫШ У 25 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ ПРЫПАЎ НА БЕЛАРУСЬ. У Менску атрыманы весткі аб тым, што галоўны выйгрыш першай пазыкі індустрыялізацыі ў 25 тысяч рублёй прыпаў на Беларусь. Сэрыі з аблігацыямі гэтага выйгрышу былі рэалізаваны беларускай канторай Дзяржбанку. Трымальнік аблігацыі—невядомы.

— ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ НОРМЫ ХЛЕБА ДЛЯ ТАРФЯНЫХ РАБОЧЫХ. Наркамгандаль БССР устанавіў наступную норму водпуску хлеба для рабочых, занятых на торфараспрацоўках: для мужчын 1000 грам печанага хлеба альбо 725 грам мукі, для жанчын 800 грам хлеба альбо 580 грам мукі.

Вялікі посьпех дзяржаўнай пазыкі 1929 году

За кароткі тэрмін новая дзяржаўная выйгрышная пазыка 1929 г. рэалізавана па Беларусі на сумму ў 450 тысяч рублёў. У апошнія дні ў касах Дзяржбанку і ашчаднасьці адзначаецца вялікі попыт на аблігацыі. Дзяржбанк тэрмінова запатрабаваў з Масквы высылкі дадатковай партыі аблігацый.

Умацоўвайце новыя формы змычкі

Уздым сельскае гаспадаркі і сацыялістычнае яе перабудаваньне ёсьць справа ня толькі сялян, але і рабочае клясы. Таму XVI партканфэрэнцыя і патрабуе **«ўзмацненьня зносін пралетарскага гораду з вёскай, як мэтаду ўмацаваньня кіруючай ролі рабочае клясы ў вёсцы.»**

Тое складанае і вялізнае будаўніцтва, якое намечана пяцігадовым плянам, можна ажыцьцявіць толькі пры наяўнасьці трывалага саюзу гораду і вёскі. Пралетарыят гэтага не павінен забыць і праводзіць у жыцьцё дырэктывы XVI партканфэрэнцыі. Гэтыя дырэктывы закранаюць рад мерапрыемстваў, якія мы абавязаны разгарнуць. На першым месцы па сваім уздыме стаяць мерапрыемствы па ўзьняцьці індывідуальнае сялянскае гаспадаркі. Зразумела, не таму, што гэта самая лепшая прылада перабудовы сялянскае гаспадаркі. Але хлеб і сырэц нам неабходны зараз, а сацыялістычны сэктар сельскае гаспадаркі толькі праз 5 год дасьць 23 проц. таварнай прадукцыі. Пакуль-што асноўны прадуктар—селянін-серадняк і таму трэба дапамагчы яму пашырыць сваю гаспадарку, узьнімаць яго ўраджайнасьць.

Аднак, мы ня можам накіроўваць гэту гаспадарку па капіталістычным шляху. Таму адначасова мы прымаем меры да таго, каб селянін цягнуўся ў калгас. Найлепшымі сродкамі для дасягненьня гэтай мэты зьяўляюцца кантрактацыя і арганізацыя міжсяленных машына-трактарных станцый і трактарных калён.

Кантрактацыя ня толькі забясьпечвае дзяржаве добраахвотную здачу таварнага збожжа, што нам вельмі важна, але і прыводзіць да ўздыму ўраджайнасьці. Уздым ураджайнасьці зьяўляецца вынікам таго, што па кантрактацыйным дагаворы селянін абавязаны правесьці ў сваёй гаспадарцы рад паляпшэньняў. Аграмаджаньне адбываецца таму, што дагаворы заключаюцца не з асобнымі дварамі, а з цэлымі зямельнымі таварыствамі і калгасамі. Гэтыя зямельныя таварыствы, такім чынам, супольна пераходзяць да палепшаных спосабаў апрацоўкі і калектыўных мэтадаў працы. Значэньне кантрактацыі відаць з таго, што ў бягучую пасеўную кампанію закантрактавана каля 15 млн. гэктараў пасеваў, што павінна даць дзяржаве да 250 млн. пуд. таварнага збожжа. З гэтай плошчы на частку калгасаў прыходзіцца толькі каля 1,5 млн. гэктараў. Уся рэшта плошчы—гэта зямельныя таварыствы. Значыць, вялізная пасеўная плошча адзіноасабовых гаспадарак ахоплена кантрактацыяй. Гэтая гаспадарка падпадае пад дзяржаўнае рэгуляваньне і наближаецца да аграмаджаньня.

Значна хутчэй ідзе працэс калектывізацыі пры дапамозе трактарных калён і міжсяленных машына-трактарных станцый. Гэта тлумачыцца тым, што машына-трактарныя станцыі і калёны, даючы сялянам трактары і ўдасканаленыя с.-г. машыны, ставяць сялян перад неабходнасьцю аграмаджваць палі. Заворваюцца межнікі, зьнішчаюцца цераспалосіца і дальнаязмельле. На месца вузкіх палосак зьяўляюцца вялічэзныя палі, апрацаваныя пад кіраўніцтвам аграномаў і засеяныя гатунковым насеньнем. Селяніну гэта дае павышэньне ўраджаю пудоў на 20-30 з гэктару, а плаціць ён саўгасу або каапэрацыі толькі 15-20 пудоў. Конь становіцца непатрэбны селяніну. Ён прадае яго, купляе карову або пашырае іншыя галіны гаспадаркі. Гэтыя выгоды аказваюцца мацней ранейшых навыкаў, і селянін ахотна ідзе на аграмаджаньне пасеваў. Дзяржава атрымлівае ад сялян па дагаворы таварнае збожжа добрае якасьці, а павышэньне ўраджайнасьці дае нагул прырост прадукцыі сельскае гаспадаркі краіне.

Улічваючы важнасьць гэтых мерапрыемстваў, рабочыя абавязаны праз свае шэфскія таварыствы і зямляцтвы шырока разгарнуць работу на кантрактацыі, па будаўніцтве міжсяленных машына-трактарных станцый, па калектывізацыі сялянскіх гаспадарак.

ЛАЦІС.

Ц. С. П. С. Б. склікае нараду часопісі „ПРАФРУХ БЕЛАРУСІ“

у панядзелак 3 чэрвеня, а 6 г. у ДОМЕ ПРАЦЫ (заля пасяджэньняў)

для абмеркаваньня наступных пытаньняў:

1) Інф. інструктара ВЦСПС т. Б. Файнгольда аб задачах абсьледваньня ЦСПСБ.

2) Дакл. рэдактара часопісі «Прафрух» т. Платуна.

На нараду запрашаюцца: усе менскія рабкоры «Прафруху» і Маскоўскага Прафэсыянальнага друку, старшыні культкамісій ФЗМК, рэдактары насьценных і друкарскіх заводзкіх газэт, заг. культоддзеламі ЦП саюзаў.

Сяляне Беларусі здалі калектыўна 2450 тон хлеба

У сёлетнюю хлебазагатоўчую кампанію сяляне па прыблізных даных здалі калектыўна чырвонымі абозамі спажывецкай каапэрацыі Беларусі каля 2450 тон хлеба. Сюды не ўваходзіць значная колькасьць хлеба, зданага калектыўна іншым каапэрацыйным арганізацыям.

Першым пачынальнікам у гэтай справе выступіў Слуцкі раён, які толькі ў якасьці падарунку Ўсебеларускаму Зьезду Саветаў здаў 65 тон хлеба, сяляне Менскае акругі перадалі Зьезду Саветаў 120 тон, усяго-ж Менская акруга здала калектыўна спажывецкай каапэрацыі 500 тон хлеба. На першым месяцы ў акрузе ідуць Койданаўскі, Пухавіцкі і іншыя раёны.

Дзе будзе знаходзіцца мастацкі тэхнікум

Калегія Наркамасьветы вынесла рашэньне аб рэарганізацыі Віцебскага мастацкага тэхнікуму на наступных падставах: пры тэхнікуме будуць арганізаваны два аддзелы—пэдагагічны і ганчарна-керамічны. Апрача таго, Галоўмастацтву даручана абгаварыць пытаньне аб мэтазгоднасьці арганізацыі дэкарацыйнага аддзелу. Сёлета мастацкі тэхнікум будзе знаходзіцца ў Віцебску. Даручана Галоўмастацтву ўзьняць у СНК пытаньне аб водпуску сродкаў на пабудову спэцыяльнага будынку ў Менску для Віцебскага мастацкага тэхнікуму.

Калегія Наркамасьветы прынцыпова прызнала патрэбным арганізацыю ў Беларусі вышэйшай мастацкай навучальнай установы. Пытаньне аб тэрміне адкрыцьця гэтай навучальнай установы даручана распрацаваць Галоўмастацтву.

Да рэдкалегій насьценгазэт

Паведамляецца, што выстаўка насьценгазэт з 25-V зачыняецца. Насьценгазэты выдаюцца ва ўсе дні ад 7 да 10 г. увечары акрамя аўторка.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— У нядзелю, 2 чэрвеня, арганізуецца грандыёзная маёўка-экскурсія працоўных палякоў г. Менску.

Разнастойная праграма: спартыўныя спаборніцтвы на прызы, стральба, футбол, баскет-бол, гарадкі, лётарэі, масавыя гульні.

Іграе духавы аркестр музыкі. Буфэт па танных цэнах, дармовы праезд у Баравую і назад.

Запіс на маёўку-экскурсію вядзе польскі рабочы клюб Імя Р. Люксэмбург, канцыляры 6-ай і 33-й польскіх школ, а таксама вопытная школа пры польпэдтэхнікуме.

— У панядзелак, 27 мая, а 9 г. ув., у ленінскім габінэце Камвузу адбудзецца пасяджэньне філёсофскай сэкцыі навуковага таварыства марксыстых. На павестцы дня: 1) Даклад тав. Успенскага «Эволюцыя фізыкі»; 2) пытаньне аб перарагістрацыі членаў сэкцыі і аб утварэньні таварыства ваяўнічых матэрыялістаў-дыялектыкаў. Яўка для членаў сэкцыі абавязкова.

— На панядзелак, 27-га мая патрабуецца 300 чалавек рабочых для пасылкі іх на сэзонныя будаўнічыя работы.

Пасылка будзе праводзіцца ад усіх сэкцый.

Беспрацоўныя, якія лічацца на вучоце чорнарабочай сэкцыі, павінны зьявіцца ў сваю сэкцыю роўна а 8 гадзіне раніцай.

—27-V, а 6 гадз. ув., у памяшканьні Фрунзаўскага райкому КП(б)Б, адбудзецца нарада жэноргаў і старшынь фабкомаў-партыйцаў па пытаньні аб арганізацыі ясель і дзіцячых пляцовак.

Павінны зьявіцца жэноргі і старшыні фабкомаў-партыйцы наступных прадпрыемстваў: хлебазаводу, 1-й друкарні, падсобных майстэрань, п. к. тэкстыльшчыкаў, п. к. пекароў, хімікаў, «Прагрэс», «Пралетары», «Беларусь», Эльвод галянтарэйная ф-ка.

— У панядзелак, 27-V, а 7 г. ув., у памяшканьні Фрунзаўскага РК КП(б)Б, адбудзецца нарада жэноргаў і апоргаў усіх ячэек КП(б)Б Фрунзаўскага раёну. Яўка ўсіх абавязкова.

— 27-V, а 6 г. ув., у памяшканьні Фрунзаўскага РК КП(б)Б, склікаецца інструкцыйная нарада аб утрыманьні 2-й пазыкі індустрыялізацыі. Ніжэйпамянёныя т. т. павінны зьявіцца на нараду: Нускультэр, Верба, Паўлоўскі, Фрыдман, Брандабоўскі, Якшэвіч, Сазаў, Наўмёнак, Гродзкі, Прынц, Шмідт, Мелашкевіч, Чэлядзінскі, Граеўская, Нісэнбаум, Тарасэвіч, Школьнікаў, Гурэвіч, Ледвіч, Шындлер, Прафэрансаў, Дрылёнак, Валасевіч, Рудаміно, Гуманаў, Радкевіч, Давідовіч, Круглік, Казачэнка, Матусэвіч, Петрашэвіч, Кіркевіч, Зэвін, Байдаліна, Вострыкаў, Гельфэр, Калінштэйн, Вішнеўская, Мацюкевіч.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

Дом пісьменьнікаў (САВЕЦКАЯ, 68) — (Сёньня, 26 мая, а 7-й гадз. увеч. АДБУДЗЕЦЦА

ГАДАВЫ ЛІТАРАТУРНЫ СХОД „УЗВЫШША“,

ПРЫСЬВЕЧАНЫ ТРОХГАДОВАЙ ПРАЦЫ ЗГУРТАВАНЬНЯ

На сходзе будзе:

1) Уступнае слова—К. ЧОРНЫ
2) Даклад пра узвышшаўскую творчасьць—А. БАБАРЭКА
3) Беларускі аналітычны альфабэт—дакл. УЛ. ДУБОЎКІ
4) Прыём новых сяброў.

Запрашаюцца пісьменьнікі і чытачы

Уваход вольны. «УЗВЫШША».

У панядзелак, 27 мая, у будынку кіно „Юны піянэр“ (Савецкая, 87) АДБУДЗЕЦЦА

ДЫСПУТ

на тэму:

Вопыт працы і задачы дзіцячага кіно

Уступнае слова нам. заг. Белдзяржкіно т. МАТУСАВА.

Білеты дасылаюцца па арганізацыях і школах

Увага: па прычыне малай колькасьці месц у кіно, просьба да т. т., якія атрымаюць білеты, правесьці па магчымасьці гутаркі па школах і піянэр-атрадах аб працы дзіцячага кіно.

Пачатак а 8-й гадзіне ўвечары.

Белдзяржкіно.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

Нядзеля, 26 мая.

З прычыны шматлікіх запатрабаваньняў яшчэ раз адкрыты спэктакль

Запяюць верацёны.

Білеты ў касе тэатру. Пачатак а 8 гадз. увечары.

Летні тэатр «ПРАФІНТЭРН»

Гастролі МАСКОЎСКАГА ЭКСПЭРЫМЭНТАЛЬНАГА БАЛЕТУ

Нядзеля, 26 мая закрытыя спэктаклі для саюзу дрэвапрацоўшчыкаў і транспартнікаў.

„Красный мак“

Пачатак а 8 з палавіною гадзіне ўвечары.

КІНО-ТЭАТР „Культура“ — Выключны посьпех! Сёньня і штодзенна **ВЯСЁЛАЯ КАНАРКА**

Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА, Савецкая, 71. — Прэм'ера! Амэрык. баявік. Адна з лепшых кінэматографіі **ЧАНГ**. Пачатак 1-га сэансу а 9 г. Каса—ад 7 г.

КІНО Інтэрнацыянал — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **ПЛЁТКА**, драма ў 7 ч. Пачатак а 7 г.

КІНО Пралетары — Мастацкі фільм **ПРАВА на ЖЫЦЬЦЁ**, Драма ў частках. Звыш прагр.—Кіно-хроніка «Савкіно» № 202|23

КІНО Спартак — Амэрыканскі трука-прыключэнцкі фільм **Загадковыя злачынствы у Амэрыцы** (ДЭДЭКТЫЎ СЬЦЮАРТ ВЭБС). у 2-х эпізодах—12 частках. 2 эпізоды—12 част. у адзін сэанс. Каса—ад 5 г.

Кіраўніцтву Начсплава Беларуска-Заходняга раёну **ПАТРАБУЕЦЦА** ДЛЯ СТАЛАЙ ПРАЦЫ **тэхнік-будаўнік**. Аклад па дагаворанасьці. З прапановамі зьвяртацца: гор. Віцебск, Начсплаў, вул. Крылова, 6

ДА ДЗЕСЯЦІГОДЗЬДЗЯ САВЕЦКАЙ КНІГІ

Беларускім Дзяржаўным Выдавецтвам і Аддзяленьнем „ГИЗ'а РСФСР“ у Менску

АДЧЫНЕНА ВЫСТАЎКА САВЕЦКІХ КНІГ, ГАЗЭТ І ПЭРЫОДЫКІ

на беларускай, расійскай, яўрэйскай, польскай, латыскай, літоўскай і украінскай мовах.

Выстаўка адчынена штодзенна (АКРАМЯ АЎТОРКАЎ) **з 22 мая па 5 чэрвеня г. г.**

у працоўныя дні з 6 да 9 гадзіны увечары, а ў дні адпачынку з 1 гадзіны дня да 7 гадзіны увечары.

УВАХОД для ўсіх БЕСПЛАТНЫ.

Наведвальнікам групаю даюцца тлумачэньні аб савецкім друку.

Выстаўка зьмяшчаецца ў памяшканьні Камвузу па Унівэрсытэцкай вул., № 27.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА і Бел. аддзяленьне «ГИЗ'а РСФСР»

ЦСАВЕТ АСОАВІЯХІМУ БССР ВЫПУСЬЦІЎ ДЛЯ БАРАЦЬБЫ З ХАТНІМІ ПАРАЗІТАМІ (клапамі, тараканамі і молью) **СРОДАК** па рэцэпту члена Цэнтральнага Савету Асоавіяхіму прафэсара хэміі З. В. ЗМАЧЫНСКАГА. Сродак прадаецца ў магазыне Снаба, Савецкая, 83, **па даступнай цане.** Для ячэек Асоавіяхіму СКІДКА.

АБВЕСТКА. На 29 мая г. г. назначаны **ВУСНЫЯ ТАРГІ** на здачу ў арэнду **САДУ** пры Менскім Цэнтральным Справіцельным Доме. Жадаючыя прыняць удзел у таргох павінны ўнесьці задатак у 100 руб. ТАРГІ адбудуцца ў канцыляры Спраўдому а 10 гадз. раніцы.

ВІЦЕБСКАМУ АКРСЕЛЬСАЮЗУ **ПАТРАБУЕЦЦА** для сталай працы **тэхнік-будаўнік**. Умовы працы па згодзе. Жадаючыя могуць падаць заяву па адрасе: г. Віцебск, Акрсельсаюз

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

Цэнтр. Кіраўніцтва Дзяржцыркамі **ГАСТРОЛІ МАСКОЎСКАГА ДЗЯРЖЦЫРКУ**. Расійскія і замежныя атракцыёны. Адчыненьне 6 чэрвеня

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты „ЗЬВЯЗДА“ звяніце па тэл. **2-49**

Не спажывайце алькагольных напіткаў, шкодных для здароўя.

ПЕЦЕ толькі КАУКАСКІЯ НАРЗАН Натуральныя Мінэральныя Воды

ЭСЕНТУКІ № 20 — Адзіныя столовыя воды з натуральнай вуглякіслатой.

ЭСЕНТУКІ № 4, № 17, № 18 | БАТАЛІНСКАЯ СЬМІРНОУСКАЯ СЛАВЯНАУСКАЯ | **БАРЖОМ**

Са складу 25% адпускаюцца па гуртавых цэнах. З дармовай дастаўкай на дом. Заказы вагонамі прымаюцца па зніжаных цэнах і асобна ільготных умовах.

КАРЫСТАЙЦЕ КАЎКАЗ на ДАМУ!

Замяняйце ўсе напіткі толькі адзіна-карысьнымі каўказкімі водамі!

Раённы склад Белмэдгандлю: Менск, рог Савецкай і Энгельса 26-92, тэл. 374.

АСЬЦЕРАГАЙЦЕСЯ ПІЦЬ ШТУЧНЫЯ ВОДЫ!

ФОТО-ЦЫНКАГРАФІЯ ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ НА КЛІШЭ МАСТАЦКАЕ ВЫКАНАНЬНЕ РЭСУНКАЎ

З ЗАКАЗАМІ ЗВАРОЧВАЦЦА ГАЛОЎНУЮ КАНТОРУ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА“ МЕНСК, САВЕЦКАЯ, № 63, 3-ці ПАВЕРХ.

ПАРТРЭТЫ, ГРАВЮРЫ, ПЛЯНЫ, СХЭМЫ, ФАКСІМІЛЕ, ЭТЫКЭТЫ, ЦЭНЬНІКІ, ВОКЛАДКІ, ВІНЬЕТКІ, РЭКЛЯМНЫЯ ПЛЯКАТЫ і іншыя МАСТАЦКІЯ РАБОТЫ

Для здачы **АБВЕСТКІ** ў газэту „ЗЬВЯЗДА“ звяніце па тэл. **7-81**

Згубленыя і ўкрадзеныя дакуманты

лічыць несапраўднымі:

Мэтрычная выпіс Галенсона Л. Г., выд. Менск. Загсам. 1726

Вуч.-конская кн. Мэтрыка Ш. М. 1727

Пашпарт Адамайтыса І. А. выд. Барысаўскай міліцыяй. 1728

Біржавая картка Шумілінскай Г. Л., выд. Менскай біржай працы. 1729

Пашпарт Ляўковіч Е. І., выд. Віцебскай міл. 1730

Коштпублікацыі 50 К. аб згубе дакумэнту

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск